# Голас Радзімы

№ 41 (1252) КАСТРЫЧНІК 1972 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 17-ТЫ ЦАНА 2 КАП.



МИНСК ГСП Красноармейская 9 Библиотека им. Ленина


# ДА ВЫШЫНЬ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ

**З прэс-канферэнцыі намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Н. СНЯЖКОВАЙ**

У кожным нумары беларускіх газет, у кожным папулярным часопісе значная частка друкаванай «плошчы» адводзіцца матэрыялам на тэмы навукі, адукацыі, культуры. У рэспубліцы, напрыклад, праходзілі дні братніх савецкіх літаратур — і прэса цэлыя старонкі аддавала расказам аб сустрэчах пісьменнікаў з працоўнымі Беларусі. Адбывалася дэкада польскай кнігі — і чытачы газет і часопісаў маглі сачыць за ўсімі мерапрыемствамі.

Тэатральныя рэцэнзіі, анатацыі на новыя кнігі, артыкулы аб культурным жыцці на вёсцы і новых сталічных прэм'ерах, паведамленні аб апошніх адкрыццях беларускіх вучоных і нарысы аб выдатных даследчыках даўно сталі традыцыйнымі і выклікаюць у чытачоў нязменную цікавасць.

Такая ўвага да пытанняў нацыянальнага духоўнага развіцця не выпадковая — культурнае жыццё савецкіх людзей становіцца ўсё больш разнастайным і поўным, а навука пранікае ва ўсе сферы чалавечай дзейнасці.

Аб гэтым сказала ў пачатку свайго выступлення на прэс-канферэнцыі, прысвечанай стану і перспектывам беларускай навукі, адукацыі і культуры, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Ніна Сняжкова:

«Мы жывём у такі час, у такіх умовах, калі асабліва наглядна пацверджана ленінскае прадбачанне аб тым, што сацыялізм нясе народным масам далучэнне да ўсіх сфер і галін чалавечай культуры, калі ўсе цуды тэхнікі, усе заваёвы культуры становяцца агульнанародным здабыткам».

Далейшае развіццё сацыяльных адносін і вытворчасці, прагрэс культуры немагчымы зараз без навукі. Таму асабліва многа пытанняў журналісты задалі аб яе будучым.

Сёння навукова-даследчай работай у нашай рэспубліцы займаюцца больш за 180 навуковых устаноў, у якіх працуюць каля 24 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў. Пераважнымі тэмпамі развіваюцца даследаванні ў галіне фізікі, матэматыкі, хіміі, радыёэлектронікі, ядзернай энергетыкі, геалогіі, біялогіі, медыцыны. Вучоныя Беларусі звязваюць тэмы сваіх пошукаў з надзённымі праблемамі народнай гаспадаркі. Як вядома, так была адкрыта беларуская нафта, знойдзены запасы сільвініту і наладжана яго перапрацоўка, створаны высакаякасныя сарты сельскагаспадарчых культур, укаранёны многія прагрэсіўныя тэхналагічныя працэсы.

Далейшы этап сумеснай работы вучоных і практыкаў — вырашэнне шэрагу комплексных навукова-тэхнічных праблем, такіх, як асваенне Палескай нізіны, ахова прыроды, разведка нетраў і здабыча карысных выкапняў і іншыя.

Значныя дасягненні і тых вучоных, якія займаюцца грамадскімі навукамі: вывучэннем асноўных этапаў гісторыі беларускага народа і Кампартыі Беларусі, актуальнымі тэарэтычнымі праблемамі камуністычнага будаўніцтва. Плён такіх даследаванняў — выпушчаныя ў свет 5 тамоў 12-томнага выдання Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, падрыхтаваная да друку 5-томная гісторыя БССР, маючая выйсці 3-томная гісторыя ўсенароднай барацьбы беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Грандыёзныя перспектывы развіцця навуковых даследаванняў у Беларусі ў бліжэйшыя гады. Да канца пяцігодкі асігнаванні на будаўніцтва навуковых устаноў павялічацца ў 1,8 раза і складуць за 5 год 100 мільёнаў рублёў. Журналісты даведаліся, што неўзабаве будуць узведзены комплекс лабараторый высокіх ціскаў інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, новы лабараторны корпус з канструктарскім бюро, механічнымі майстэрнямі і выпрабавальнымі заламі фізіка-тэхнічнага інстытута, корпус мадэльных установак інстытутаў хімічнага профілю і іншыя аб'екты.

Больш цеснымі стануць сувязі навукі з вытворчасцю.

Далей па просьбе журналістаў Н. Сняжкова расказала аб праблемах падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі і культуры. У Беларусі ўжо цяпер створана магутная база для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшага і сярэдняга звяна. У 28 вышэйшых навучальных установах можна набыць 164 прафесіі, а ў 129 тэхнікумах — 187.

Аднак у бягучай пяцігодцы прадугледжана далейшае пашырэнне сеткі навучальных інстытутаў і тэхнікумаў. У Магілёве ствараецца тэхналагічны інстытут, у Мінску — інстытуты культуры і архітэктурна-будаўнічы, у Наваполацку — індустрыяльны інстытут. Ідзе будаўніцтва некалькіх новых тэхнікумаў, а колькасць прафесійна-тэхнічных вучылішчаў узрасце са 152 да 193 з кантынгентам навучэнцаў 115 тысяч чалавек.

Значнае месца на прэс-канферэнцыі было ўдзелена пытанням асветы і культуры. Н. Сняжкова расказала аб мерапрыемствах па перабудове сельскіх школ, аб падрыхтоўцы да пераходу да абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі, аб новых навучальных праграмах.

Цікава было даведацца, што за пяцігодку ў беларускіх гарадах і вёсках плануецца пабудаваць 357 новых буйных школ. Значна палепшыцца матэрыяльна-тэхнічная база сельскіх школ.

Яшчэ больш уражваючыя перспектывы ў галіне культурнага будаўніцтва. Пастаўлена задача ў кожным раённым цэнтры рэспублікі на працягу бліжэйшых год стварыць паўнацэнныя культурныя комплексы, якія будуць уключаць у сябе дамы культуры, кінатэатры, дзяржаўныя або грамадскія музеі, паркі культуры і адпачынку, музычныя школы, масавыя і дзіцячыя бібліятэкі.

У дзевятай пяцігодцы за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў прадугледжана пабудаваць 19 новых раённых дамоў культуры і столькі ж кінатэатраў. На будаўніцтва клубаў у саўгасах дзяржава выдзеліла 7,5 мільёна рублёў. У калгасах на працягу пяцігодкі прадугледжана адкрыць больш за 600 клубаў, завяршыць работы па пераўтварэнню амаль паўтары тысячы прыклубных бібліятэк у самастойныя сельскія. Такім чынам, кнігу можна будзе атрымаць у любым населеным пункце.

У вясковых клубах пачнуць працаваць 430 новых кінаўстановак і завершыцца пераабсталяванне ўсіх сельскіх стацыянарных кінаўстановак для паказу шырокаэкранных фільмаў.

Н. Сняжкова прывяла яшчэ цэлы шэраг даных, якія сведчаць, што пытанням развіцця навукі, адукацыі і культуры наша партыя і ўрад надаюць першараднае значэнне.

**Дом культуры калгаса імя Дзяржынскага Слуцкага раёна. Падобныя будынкі вясковых клубаў, дамоў культуры ўпрыгожваюць цэнтры многіх калгасаў і саўгасаў ва ўсіх раёнах рэспублікі.**

**Фота А. ПЕРАХОДА.**



Прадукцыю Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна ведаюць далёка за межамі нашай рэспублікі. Апаратчыца Валянціна АСКОЛЬЧАНКА — адна з тых, хто вырабляе яе.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

●

## БРЭСЦКІ КАМП'ЮТАР

На Брэсцкім электрамеханічным заводзе выраблена першая электронна-вылічальная машына трэцяга пакалення на інтэгральных схемах. Пакладзен пачатак серыйнай вытворчасці электронна-вылічальных машын «ЕС-1020» у Брэсце.

Выкарыстаўшы інтэгральныя схемы, канструктары заклалі ў новую машыну больш кампактны электронны «мозг». Дзякуючы дыскавым запамінальным канструкцыям паскорыўся пошук неабходнай інфармацыі. Значна аблегчана змена каманд. Машына прызначана для рашэння розных інжынерных і гаспадарча-эканамічных задач.

## СТАНОК НОВАЙ КАНСТРУКЦЫІ

На станкабудаўнічым заводзе ў Маладзечна пачалася зборка цэнтравальна-падразнога станка новай канструкцыі. Ён прызначаны для апрацоўкі дэталей у інструментальнай прамысловасці.

## РАСЦЕ МАГУТНАСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА

Нарошчвае магутнасць Слуцкі кансервавы завод. Сёлета ён выпусціў ужо больш за 12 мільёнаў умоўных слоікаў кансерваў з 20 мільёнаў запланаваных.

Прадпрыемства рэканструюецца, механізуюцца працаёмкія працэсы. Рацыяналізатары і вынаходнікі завода ўкаранілі ў гэтым годзе больш як дваццаць прапаноў, эканамічны эфект якіх склаў каля васемнаццаці тысяч рублёў.

## ОРДЭН—ІНСТЫТУТУ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР старэйшая педагагічная вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі—Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Горкага ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Народжаны паўстагоддзя таму назад, інстытут падрыхтаваў 26 тысяч высокакваліфікаваных настаўнікаў. Прычым больш як 22 тысячы з іх—у пасляваенныя гады. Гэтыя лічбы прывёў у сваёй прамове на мітынгу студэнтаў і выкладчыкаў, прысвечаным узнагароджанню інстытута ордэнам, яго рэктар прафесар Ф. Шмыгаў.

## ПАЎСТАЮЦЬ КВАРТАЛЫ

На цэнтральнай вуліцы Наваполацка — Маладзёжнай пачаўся мантаж самага вялікага ў горадзе буйнапанельнага дзевяціпавярховага жылога дома. Ён разлічаны на 216 кватэр палепшанай планіроўкі.

Сёлета ў горадзе прадугледжваецца здаць у эксплуатацыю каля 50 тысяч квадратных метраў жылой плошчы.

## ПРЫГОЖА, ПРАКТЫЧНА

У павільёне тавараў народнага спажывання на ВДНГ СССР экспануецца шырокі асартымент тавараў. Асаблівую ўвагу шматлікіх наведвальнікаў прыцягвае беларуская мэбля.

Для яе экспазіцыі зроблена аднапакаёвая кватэра натуральных размераў, у якой паказаны наборы мэблі для жылога пакоя.

Звяртае ўвагу арыгінальная канструкцыя канапы-ложка, што трансфармуецца ў становішчы «ложак» паваротам спінкі вакол гарызантальнай восі. Цікавая канструкцыя крэслаў для адпачынку са здымнымі падушкамі сядзення і спінкі.

Сярод камбінаваных шафаў асаблівую цікавасць выклікае тая, у якой аддзяленне для тэлевізара абсталявана арыгінальнымі складнымі дзверкамі тыпу жалюзі. Яе распрацаваў калектыў эксперыментальнага канструктарска - тэхналагічнага бюро мэблі, а выпускае Барысаўскае вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне.

На выстаўцы экспануецца набор мэблі для спальні. Умяшчальныя шафы з антрэсолямі, двухспальны ложак са спінкай, абцягнутай штучнай скурай, арыгінальная туалетная тумба з люстэркам, якая можа быць выкарыстана і як рабочы стол,—усё гэта прыгожа і практычна. У 1973 годзе Слонімская мэблевая фабрыка асвоіць серыйную вытворчасць набора.

## СІМПОЗІУМ ГІСТОРЫКАЎ-АГРАРНІКАЎ

У Гродна адбылася XIV сесія міжрэспубліканскага сімпозіума па аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы. У сесіі прынялі ўдзел больш за сто вучоных-гісторыкаў з сямі саюзных рэспублік. На секцыях былі разгледжаны праблемныя пытанні аграрнай гісторыі ў розныя эпохі.

Усяго прачытана звыш 100 дакладаў і паведамленняў, 15 з іх—па матэрыялах Беларусі. У перыяд сесіі вучоныя наведалі перадавыя гаспадаркі Гродзенскай вобласці.

## ЗАПРАШАЕ «ПАЎЛІНКА»

Пасля рэканструкцыі гасцінна адчыніліся дзверы мінскага фірменнага магазіна «Паўлінка». Больш прасторнай і светлай стала гандлёвая зала, яна ўпрыгожана вітражамі і маляўнічым беларускім арнаментам. У арыгінальных вітрынах і на стэндах—самыя разнастайныя тавары, выробленыя на прадпрыемствах Міністэрства мясцовай прамысловасці рэспублікі.

Мнагалюдна ля стэнда «Тавары, адзначаныя знакам якасці». Тут прадстаўлены вырабы ўмельцаў Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Гомельскай фабрык мастацкіх вырабаў.

# ПАМЯЦЬ НА 500 ГОД

**Праблемы стандартызацыі інфармацыйна-вылічальнай тэхнікі абмеркавала ўсесаюзная нарада, якая адбылася ў Мінску. Пасля яе заканчэння старшыня аргкамітэта Усесаюзнага савета навукова-тэхнічнага таварыства па стандартызацыі, член-карэспандэнт АН СССР Б. САТСКОЎ адказаў на пытанні журналіста В. ШАНЬКОВА.**

— На нашых вачах, — сказаў Б. Сатскоў, — шпарка развіваецца новая галіна народнай гаспадаркі — дзяржаўная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма, звязаная з машыннымі метадамі і сродкамі атрымання, перадачы, апрацоўкі і выкарыстання інфармацыі. Пачата работа па стварэнню асобных яе звенняў. Да гэтага часу канструяваліся лакальныя аўтаматызаваныя сістэмы кіравання (АСК) — прадпрыемстваў і галін. Іх аб'яднанне прадугледжана пяцігадовым планам. Вырашыць гэту задачу магчыма толькі агульнымі намаганнямі спецыялістаў, якія працуюць у розных ведамствах.

**— Якія праблемы паўстаюць на гэтым шляху?**

— Праблем мноства. У краіне створаны шэраг сямействаў ЭВМ, якія адрозніваюцца адна ад адной машыннымі кодамі, параметрамі сігналаў і носьбітаў інфармацыі, элементнай базай. Гэта ўскладняе пабудову інфармацыйных сістэм, дзе патрабуецца аб'яднанне работ некалькіх ЭВМ. Для стварэння вялікіх інфармацыйных сістэм патрэбна сумяшчальнасць гэтых машын, стандартызацыя ўсёй тэхнічнай дакументацыі. Цяпер няма адзіных метадаў пастаноўкі задач на вылічальныя машыны. Неўпарадкаванасць машынных «моў» каштуе краіне вельмі дорага.

Неабходна таксама стварыць узаемаўвязаныя сістэмы уніфікаваных дакументаў, адзіную сістэму класіфікацыі і кадзіравання змешчанай у дакументах інфармацыі.

Стандартызацыя заклікана выратаваць ад забыцця велізарную масу набытых ведаў. Магчыма, наяўную машынную інфармацыю трэба перапісваць або пакідаць у архівах камплекты абсталявання для счытвання і перазапісу. Перад вучонымі і інжынерамі стаіць вельмі важная задача — знайсці нестарэючы, прыгодны на 300—500 гадоў носьбіт інфармацыі.

**— Што ўжо зроблена па стандартызацыі інфармацыйна-вылічальнай тэхнікі?**

— Пяць гадоў у краіне дзейнічае дзяржаўная сістэма прыбораў і сродкаў аўтаматызацыі (ДСП) і амаль столькі ж створаная на той жа аснове універсальная сістэма кантролю, рэгулявання і кіравання (УРС), прынятая ў краінах СЭУ. Яны прадугледжваюць агульныя параметры прыбораў, стандартныя сігналы, крыніцы сілкавання, далучальнасць і г. д. Краінамі СЭУ ствараецца адзіны шэраг уніфікаваных электронных вылічальных машын. Першая такая ЭВМ — «ЕС-1020» — выпушчана ў Мінску.

Работа, якая праводзіцца ў краіне па гэтых напрамках, павінна атрымаць яшчэ большае развіццё. Для гэтага неабходна прыцягнуць новыя сілы навукова-тэхнічнай грамадскасці, якая працуе ва ўсіх галінах інфармацыйнай тэхнікі.



Планамі дзевятай пяцігодкі ў рэспубліцы прадугледжана павялічыць выпуск мяса-малочнай прадукцыі на 43,5 працэнта. НА ЗДЫМКУ: вакуумна-апаратнае аддзяленне Лепельскага малочна-кансервавага завода.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●

# ПРАЕКТ БРЭСТЧАН

У балгарскім горадзе Варне закончыўся XI Сусветны кангрэс Міжнароднага саюза архітэктараў, прысвечаны адной з актуальных праблем сучаснасці — «Архітэктура і адпачынак». Рабоце кангрэсу спадарожнічаў міжнародны конкурс студэнцкіх праектаў на гэтую ж тэму.

Перад адпраўкай у Варну ў Саюзе архітэктараў СССР адбыўся прагляд прадстаўленых вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краіны работ будучых архітэктараў. 27 лепшых работ дваццаці адной архітэктурнай школы краіны атрымалі пуцёўкі на міжнародны конкурс. Сярод іх праект сёлетніх выпускнікоў Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута А. Суворава і В. Нікіціна «Прастора калектыўнага адпачынку» для перспектыўнага сельскагаспадарчага пасялення на 5 000 жыхароў, выкананы пад кіраўніцтвам выкладчыка В. Храноўскага.

Гэта не выпадковы поспех маладых архітэктараў. Усё пачалося з работы ў гуртку студэнцкага навукова-тэхнічнага таварыства, дзе яны далучыліся да навуковага пошуку. Будучыя спецыялісты выступалі з дакладамі на інстытуцкіх, рэспубліканскіх, міжвузаўскіх канферэнцыях. Анатоль Суворaў у сааўтарстве з Барысам Школьнікавым удзельнічаў ва ўсесаюзным конкурсе праектаў раённай і сельскай бібліятэкі. Іх праект набыло Міністэрства культуры РСФСР.

Але каб удзельнічаць у міжнародным конкурсе, трэба было ведаць яшчэ больш. Студэнты вывучылі фундаментальныя працы па архітэктурнаму праектаванню, прагледзелі ўсю перыёдыку за апошнія годы. Акрамя таго, спатрэбілася вывучыць навуковыя асновы арганізацыі і спецыфікі адпачынку розных сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва, людзей з рознай адукацыяй і рознымі схільнасцямі. А як будзе развівацца грамадства, якія перспектывы сельскагаспадарчых пасяленняў, прынамсі, на бліжэйшыя 20 год? Наколькі павялічыцца бюджэт свабоднага часу чалавека? І яшчэ сотні пытанняў, дзесяткі праблем...

Будучыя архітэктары зрабілі выдатныя чарцяжы, складаныя макеты, падрыхтавалі тлумачальную запіску. Нават недасведчаны ў тонкасцях архітэктуры, зірнуўшы на работу Анатоля і Віктара, зразумее, колькі працы, ведаў і выдумкі ўклалі яны ў сваё дзецішча.

Спецыялісты высока ацанілі праект В. Нікіціна і А. Суворава: іх работа дастойна прадставіла малады інстытут за рубяжом.

**Л. ДЗЕРАШЧУК.**

# РЭПАРТАЖ З ПАРЫЖА

САВЕЦКУЮ ўладу ў Парыжы ўзначальвае Дзмітрый Кукоўскі. Праўда, з вокнаў яго кабінета не бачна Эйфелевай вежы і Вялікіх бульвараў, Манмартра або Нотр-Дама, затое Елісейскія палі — як на далоні: без канца і краю.

Елісейскія — гэта жарт. Чатыры тысячы гектараў шчодрых калгасных палёў бягуць за гарызонт. Вёска Парыж — цэнтральная сядзіба калгаса «Кастрычнік» Пастаўскага раёна.

Шчодрасць зямлі прама прапарцыянальная клопатам і руплівасці хлебаробаў. У Парыжы працуюць вядомыя на ўсю акругу майстры высокіх ураджаяў. Амаль сорак цэнтнераў збожжавых з гектара — толькі адзін з сёлетніх рэкордных паказчыкаў. Брыгадзір комплекснай брыгады Віктар Якімовіч за высокія ўраджаі, выдатныя паказчыкі ў жывёлагадоўлі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Вось якія людзі жывуць і працуюць у Парыжы.

Я доўга думаў над пытаннем: чаму — Парыж, хто даў іншаземную назву беларускай вёсачцы? Паколькі ў райцэнтры пераканаўчых тлумачэнняў наконт гэтага мы не знайшлі, няцяжка было зразумець, што назва нарадзілася многа-многа гадоў назад і захоўвае нейкую гістарычную тайну.

Трыццаць пяць кіламетраў праглынулі колы газіка, перш чым мільгануў дарожны ўказальнік: «Парыж».

З цікавасцю азіраемся.

У цэнтры вёсачкі стаіць строгі гранітны абеліск, увенчаны зоркай. Золата літараў: «Вечная памяць загінуўшым у Вялікай Айчыннай вайне». І трыццаць тры прозвішчы...

Не ў адной захопніцкай зграі распальвала апетыты наша бяскрайняя зямля — хто толькі не спрабаваў прыбраць яе да рук! Але тут ворагі заўсёды знаходзілі бясслаўны канец. Народы-браты адстаялі незалежнасць, і няма ў свеце такой зброі, якая магла б зламаць сілу іх духу, бязмежную адданасць і любоў да Радзімы. Вось і гэтыя трыццаць тры героі — беларусы, рускія, украінцы — загінулі на полі бою. І Эйфелевай вежай узвышаецца ў беларускім Парыжы абеліск, пабудаваны калгаснікамі «Кастрычніка» ў памяць аб загінуўшых земляках. Землякі—гэта людзі, якія нарадзіліся на адной зямлі. А зямля наша называецца СССР.

Вёрткія «Запарожцы», «Масквічы», матацыклы бягуць па вуліцы. Антэны над хатамі. Зрэшты, каго цяпер гэтым здзівіш? Уласныя машыны, матацыклы, тэлевізары — звычайнае і прывычнае. Загарэліся ў Парыжы блакітныя агеньчыкі газавых пліт — зноў нічога асаблівага. Між тым старшыня калгаса Рыгор Гінько ківае то ў адзін, то ў другі бок:

— Вунь магазін. А вунь клуб. Сталовая. Школа. Аптэка. Амбулаторыя. Дзіцячы сад і яслі. Бальніца. Швейнае атэлье.

Мы круцім галовамі, ледзь паспяваючы за гаспадаром.

Нарэшце старшыня спыняецца. Унізе, сціснутая зялёнымі берагамі, бяжыць рачулка. Яна такая малая, што і назвы ёй не далі.

— Адкуль, пытаеце, Парыж пайшоў? — раптам вяртаецца да нашага першага пытання Рыгор Сяргеевіч. — А вось адсюль. — І ён шырокім жэстам запрашае нас паглядзець наўкол.

Разбегліся па ўзгорках густыя лясы; блакітныя плямы азёр ззяюць мірыядамі іскраў, высечаных з сонечных промняў; залаты цяжар палёў, што дораць людзям багатыя ўраджаі, гойдаецца бяскрайнімі хвалямі; асляпляльна блакітнае неба завяршае яркую гаму фарбаў.

— Прыгожа? — старшыня песціць позіркам прасторы калгаса. — Вось за гэтай прыгажосцю і хадзілі няпрошаныя госці з таго вялікага Парыжа. Хацеў Напалеон прыгажосць нашу прысвоіць. Кажуць, быццам, апынуўшыся тут, не ўтрымаўся ён, залез у гэту рэчку і, накупаўшыся ўдосталь, заявіў, што вельмі падабаюцца яму гэтыя мясціны, і загадаў называць іх другім Парыжам. Неўзабаве выгналі імператара, а вось аб назве вёскі не падумалі. Так і засталося — Парыж.

Пазней мы пазнаёміліся з некалькімі мясцовымі дзяўчатамі. Сапраўдныя парыжскія модніцы! Паша Вашчанка — калгасны эканаміст. Дваццаць першае лета цвіце для яе гэта зямля. За плячыма сярэдняя школа, сельгастэхнікум, стаж эканаміста, партыйны стаж. Да ўсяго ж — дэпутат сельсавета. Парыжане з павагай называюць яе Пашай Валянцінаўнай.

— Дарэчы, — дадае Рыгор Сяргеевіч, — ёсць у Парыжы яшчэ адзін дэпутат — 27-гадовы Георгій Пяткевіч, галоўны ўрач участковай бальніцы, камсамолец, выпускнік Мінскага мединстытута.

Працягваем знаёмства з калгаснымі дзяўчатамі.

Ядзя Юхновіч—рабочая. Марына Крывінцова — студэнтка Віцебскага медыцынскага вучылішча. Эдуарда Шарынская і Марыя Шатун — работніцы будаўніча-мантажнага ўпраўлення.

Наша маленькае сацыялагічнае даследаванне дае права на сур'ёзныя вывады. У кожнай з дзяўчат ужо нямала прыкметных вех у біяграфіі, яны ўжо заслужылі не адну людскую падзяку, а ім жа толькі па два дзесяткі гадоў!

У зялёным поясе Парыжа, у вёсцы Казлоўшчына, лунае над адным з домікаў чырвона-зялёны флаг нашай рэспублікі. Тут — рабочы кабінет «мэра» Парыжа, старшыні сельсавета Дзмітрыя Кукоўскага.

Яго мы засталі за работай. Разам з начальнікам будаўніча-мантажнага ўпраўлення Мікалаем Ярэнскім ён абмяркоўваў самую блізкую будучыню Парыжа — яго працоўную пяцігодку. Цэнтральная сядзіба калгаса разбудоўваецца.



У сувязі з гэтым нам прыгадалася гутарка з самай старой парыжанкай — стагадовай калгаснай пенсіянеркай Марыяй Шэмет. Яна сказала, што даўным-даўно не засталося і следу ад таго панскага маёнтка, які стаяў тут у гады яе юнацтва і ў якім яна батрачыла.

У пошуках лепшага жыцця ў чужыя краіны ад'язджалі аднавяскоўцы. У шахтах Латарынгіі шукаў сваю долю Пётр Юхновіч, але не знайшоў і зноў вярнуўся з Францыі ў свой маленькі Парыж. Потым высветлілася, што і ад даваеннага Парыжа таксама нічога не засталося: вырас новы Парыж. А пад канец гутаркі Марыя Адамаўна выказала ўпэўненасць, што гадоў так праз дзесяць, калі мы сюды прыедзем, зноў не пазнаем яе вёсачку — магчыма, гэта будзе не вёска, а цэлы горад.

— Горад — не горад, а зменіцца Парыж сапраўды непазнавальна, — гаворыць Дзмітрый Кукоўскі і паказвае план пяцігадовага развіцця калгаса.

Вечарамі парыжане ідуць у кіно, у тэатр — тэатральныя калектывы нават са сталіцы тут нярэдкія госці. На сцэне калгаснага клуба выступаюць і самадзейныя артысты — спевакі, танцоры, дэкламатары, музыканты. Зноў-такі — што і казаць: Парыж ёсць Парыж.

**Г. КРУГЛОЎ.**

●



**НА ЗДЫМКАХ:**
**За парыжскай аколіцай.**

**Пад гэтай стэлай пахаваны аднавяскоўцы парыжан, што загінулі ў гады Айчыннай вайны.**

**Калгасны пенсіянер Пётр ЮХНЕВІЧ некалі шукаў шчасця ў Францыі, але знайшоў яго на сваёй Радзіме ў родным Парыжы.**

**Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.**

## гарызонты навукі

# БУЙНОЕ АДКРЫЦЦЁ ФІЗІКАЎ

Савецкія фізікі працягваюць штурмаваць таямніцы мікрасвету. Яны выявілі новую, не вядомую раней з'яву распаду амега-мезона на дзве часцінкі: нейтральны пімезон і гама-квант. Такая кароткая формула новага буйнога навуковага адкрыцця, якое было зарэгістравана 24 верасня на пасяджэнні Камітэта па справах вынаходстваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР.

Упершыню мезон сустрэўся вучоным яшчэ чвэрць стагоддзя назад у саставе касмічных праменняў. Гэта самая кароткая жывучая і шматаблічная часцінка. Цяпер вядома больш як трыццаць мезонаў розных «сартоў» — зараджаных і нейтральных.

Амега-мезон цікавы тым, што дае магчымасць вучоным вывучаць заканамернасці моцных узаемадзеянняў элементарных часцінак. Для іх пазнання вельмі важнае значэнне мае эфект распаду амега-мезона, які адкрылі ў Інстытуце тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі.

Амега-мезоны былі атрыманы на сінхратроне пры сутыкненнях элементарных часцінак з энергіямі ад 1,25 да 4,5 мільярда электронавольт. Затым пры вывадзе пучка ў пузырковую камеру адбылося ўзаемадзеянне яго з іншымі часцінкамі. У гэты момант і адбылася галоўная падзея: распад амега-мезона на пі-мезон і гама-квант.

У час эксперыментаў было зроблена каля ста тысяч фотаздымкаў, на якіх фіксаваліся ўзаемадзеянні элементарных часцінак. З усіх прагледжаных фатаграфій выбрана сто здымкаў, якія адлюстравалі эфект распаду амега-мезона.

У паўторных эксперыментах вучоныя ЗША, Францыі і Швейцарыі зноў назіралі такую з'яву.

Адкрыццё групы маскоўскіх фізікаў мае не толькі важнае значэнне для тэорыі элементарных часцінак. Яно дало магчымасць атрымаць новыя каштоўныя даныя аб узаемадзеяннях гэтых часцінак і расшырыла нашы пазнанні аб мікрасвеце.

# НОВЫЯ ПРАФЕСІІ ШКЛОПЛАСТЫКАЎ

Пры садзейнічанні беларускіх вучоных на Далёкім Усходзе пачата будаўніцтва незвычайнага моста. Нясучыя клееныя драўляныя канструкцыі — пралётныя бэлькі — упершыню ў краіне ўмацоўваюцца шклопластыкавай арматурай. Яе вырабляе і пастаўляе на будоўлю Інстытут будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР. Эксперыментальная работа ажыццяўляецца разам з Хабараўскім політэхнічным інстытутам.

— Беларускі інстытут з'яўляецца ў краіне галоўнай навуковай установай па вырабу і выкарыстанню ў будаўніцтве шклопластыкавай арматуры. Лабараторная ўстаноўка інстытута выпрацоўвае гэты будаўнічы матэрыял з тонкага шклянога валакна і насычае яго палімерным саставам з наступнай тэрмічнай апрацоўкай. Як паказалі працяглыя даследаванні, такая арматура не ўступае, а ў некаторых выпадках пераўзыходзіць па трываласці арматурныя сталі. Даўгавечнасць канструкцый, умацаваных шклопластыкамі, у параўнанні з жалезабетонам у агрэсіўных асяроддзях павышаецца ў 5—7 разоў.

Доследныя канструкцыі з выкарыстаннем шклопластыкаў у хуткім часе будуць зманціраваны на Светлагорскім заводзе штучнага валакна. У саўгасе імя С. Прытыцкага Маладзечанскага раёна будуецца таксама з іх выкарыстаннем склад мінеральных угнаенняў, якія, як вядома, з'яўляюцца вельмі «агрэсіўнымі».

Сёлета ў інстытуце ўвойдзе ў строй першая ў краіне высокапрадукцыйная чатырохканальная паўпрамысловая тэхналагічная ўстаноўка для вырабу шклопластыкавай арматуры.

## НАПЕРАДЗЕ — ДВА ЮБІЛЕІ

Атрымала вашу пасылку з кнігамі, брашурамі і календарамі, за што шчыра дзякую. Усе атрыманыя матэрыялы будуць размеркаваны сярод членаў Саюза савецкіх грамадзян у г. Шарлеруа і выкарыстаны ў падрыхтоўцы да дня беларускай літаратуры. Гэты дзень адбудзецца 15 кастрычніка ў нашым аддзеле і будзе прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

Пасля юбілею класікаў беларускай літаратуры ў нас намечаны сямейны вечар, на якім з расказамі аб знаходжанні на Радзіме выступяць тыя, хто ездзіў да сваёй радні ў СССР, а таксама дзеці, якія пабывалі ў піянерскім лагеры ў Крыжоўцы.

Галоўным, аднак, для нас клопатам з'яўляецца падрыхтоўка да святкавання 50-годдзя СССР. Урачысты вечар мы запланавалі на снежань. Прадстаўнікі ўсіх аддзелаў збяруцца ў Бруселі. Спадзяёмся, што гэта будзе для нас вельмі радаснае і вялікае свята.

**Марыя ГАРОХ.**

Бельгія.

## ГОРАД, ЯКІ НЕ ЗАБУДУ

Я лічу сябе шчаслівай, бо пабывала ў Беларусі. Яшчэ ў дарозе, калі праз акно вагона я любавалася навакольнымі краявідамі, на мяне зрабілі вялікае ўражанне беларускія палі, лясы, азёры. Потым я наведала Хатынь, дзе ўбачыла велічны помнік ахвярам фашызму. Сэрца сціскалася ад болю, калі чытала незлічоныя лічбы ахвяр, слухала хатынскія званы. Не меншае ўражанне зрабіў на мяне і Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Я дзівілася мужнасці і самаадданасці беларускіх партызан. Балюча было ўсведамляць, колькі гора і пакут прынеслі беларусам нацысты.

Горад Мінск я ніколі не забуду. Ідзеш па яго шырокіх вуліцах, густа акаймаваных дрэвамі, бачыш прыгожыя гмахі, і проста не верыцца, што калісьці ён быў ушчэнт разбураны. Але гэта праўда. Праўда і тое, што беларусы здзейснілі вялікі подзвіг, адбудаваўшы сваю сталіцу.

Вельмі цікава было аглядаць Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі Беларусі. На ёй я пераканалася, што ваша рэспубліка мае грандыёзныя дасягненні ва ўсіх галінах эканомікі.

У Англіі некаторыя лічаць, нібыта ў Савецкім Саюзе іншаземцы не могуць свабодна хадзіць і нехта за імі сочыць. Гэта няпраўда! За ўвесь час знаходжання ў СССР за мной ніхто не сачыў і ніхто нават не праверыў мае дакументы. А калі гаварыць шчыра, то тыдзень я наогул ездзіла па краіне без пашпарта, бо забылася яго ў Ленінградзе. Пашпарт мне даслалі па пошце ў Мінск, дзе я яго і атрымала. Наогул, паездка ў Савецкі Саюз прынесла мне многа радасці.

**Мэры БУТА.**

Англія.

## «ВІЗІТНАЯ КАРТКА НАРОДА»

*Некалькі гадоў назад у рэдакцыю газеты «Голас Радзімы» пачалі прыходзіць ананімныя пісьмы са штампам штата Індыяна. У канверт з амерыканскай маркай, як правіла, укладваліся выразкі, а часам і цэлыя нумары «Голасу Радзімы», дзе людзям на фатаграфіях былі выкалаты вочы і падмаляваны петлі. Знявечаныя здымкі рабочых, калгаснікаў, пісьменнікаў, пагранічнікаў, жанчын, нават духоўных асоб суправаджаліся пагражальнымі надпісамі: «Такіх рэзалі і будзем рэзаць».*

*Хто быў аўтарам гэтых цынічных слоў? Хто з дапамогай нажніц і алоўка вымяшчаў на фотаздымках сваю звярыную лютасць да савецкіх людзей? Разгадка прыйшла выпадкова ў час падарожжа па Брэстчыне беларускага пісьменніка Леаніда Прокшы. Нарыс «Козікі», у якім ён расказаў аб агідным мінулым здрадніка Сцяпана Крайчэні, «карэспандэнта» са штата Індыяна, разам з іншымі нарысамі і артыкуламі ўвайшоў у чарговую брашуру «Бібліятэчкі газеты «Голас Радзімы» — «Візітная картка народа».*

*Назву кніжцы даў нарыс, у якім аўтар расказвае аб уражаннях ад наведвання веснавога кірмашу ў Лейпцыгу, дзе наша рэспубліка ўпершыню з гонарам прадставілася мільёнам людзей. Адным наведвальнікам падабалася гомельская мэбля, другія спыняліся каля барысаўскіх піяніна, трэція захапляліся выдатна выдадзенымі беларускімі кнігамі. Наш БелАЗ атрымаў на выстаўцы залаты медаль.*

*Цікавая сустрэча з «землякамі» адбылася ў аўтара па дарозе з Лейпцыга ў Дрэздэн: у полі, каля вёскі Люпа, працавалі два трактары «Беларусь». На пытанне, як ацэньваюць работу мінскіх машын нямецкія трактарысты, абодва адказалі коратка: «Прыма!».*

*Візітная картка беларускага народа ў краіне, якая параўнаўча нядаўна здавалася для нас недасягальным узорам гаспадарання, была надзвычай прадстаўнічая.*

*Т. РЭУТОВІЧ.*

**нашы госці**

# «ТУТ МАЁ ШЧАСЦЕ»

**Больш за два месяцы гасціў у вёсцы Тульгавічы ў сваіх родзічаў грамадзянін Аўстраліі Іван ТУРАВЕЦ. У гады другой сусветнай вайны лёс закінуў яго на чужыну. І вось амаль праз 29 год ён па прыватнай візе прыехаў у свае родныя Тульгавічы, каб пабачыцца з землякамі, паглядзець на іх жыццё. Наш няштатны карэспандэнт М. ХАМЯНКОЎ сустрэўся з І. Тураўцом і задаў яму некалькі пытанняў. Ніжэй змяшчаецца гэта інтэрв'ю.**

**— Раскажыце, калі ласка, аб Вашым жыцці ў Аўстраліі, а таксама аб нашых земляках, якія знаходзяцца ў гэтай краіне.**

— Не ведаю нават з чаго пачаць... Скажу некалькі слоў аб сваёй сям'і. У мяне ёсць жонка, ураджэнка Смаленскай вобласці, дзве дачкі, якія нарадзіліся пасля вайны. Мы з жонкай і старэйшая дачка Люба працуем, малодшая — Ларыса яшчэ вучыцца ў спецыяльнай школе, дзе хоча набыць спецыяльнасць медыка.

Скажу, што жыццё ў чужой краіне нам давялося будаваць нялёгка. Асабліва шмат здароўя каштавала сабраць грошы, каб купіць уласны дом. Зараз у нас, здаецца, ёсць усё, але толькі па-ранейшаму няма ўпэўненасці ў заўтрашнім дні: у любы час ты можаш страціць работу. Ужо два разы я зведаў, што такое быць беспрацоўным. Вельмі цяжка і трывожна, калі не ведаеш, ці ўдасца знайсці работу. Калі і вырашаць цябе ўзяць на работу, то перш за ўсё разглядзяць твой рост, мускулы і г. д. І гора таму, хто фізічна слабы.

Я па спецыяльнасці будаўнік. Працую ў адной з будаўнічых кампаній горада Мельбурна. У тыдзень атрымліваю 40—50 аўстралійскіх долараў. Заработная плата маёй жонкі складае ў месяц 120 долараў. Нам з гэтых грошай палову прыходзіцца пакідаць па «чорны дзень». Уявіце сабе такое становішча. Неяк захварэла мая жонка, і я вымушан быў адправіць яе на лячэнне ў бальніцу. Яна знаходзілася там усяго тыдзень, а каштавала гэта нам 500 долараў. Альбо другі прыклад: жанчыне, якая нарадзіла дзіця ў радзільным доме, неабходна заплаціць 350 долараў.

Не кожны бацька ў Аўстраліі зможа даць сваім дзецям адукацыю. Я, напрыклад, за вучобу малодшай дачкі плачу ў год 500—700 долараў і не маю ўпэўненасці, ці змагу ўтрымаць яе ў школе да апошняга класа. Скажу больш: чалавек без грошай тут нічога не значыць. Тут усё купляецца і прадаецца.

У Аўстраліі не ўсе людзі маюць аднолькавыя юрыдычныя правы. Асабліва ў цяжкім становішчы знаходзяцца карэнныя жыхары — абарыгены. Вось такі прыклад: у адным са шпіталяў Мельбурна працуюць дзве жанчыны, якіх я добра ведаю. Адна белая, другая абарыгенка. Першая атрымлівае ў тыдзень 38 долараў, а другая за такую самую работу — 15. Вось якая няроўнасць.

Побач са мною жыве нямала землякоў. Сярод іх ёсць беларусы. Многія з іх сумуюць па Радзіме, цікавяцца яе жыццём. Але, безумоўна, ёсць і такія, якія даўно сталі лютымі ворагамі Савецкага Саюза. Апошніх значна менш.

**— Якія Вашы ўражанні аб Радзіме, аб родных мясцінах?**

— Усе гады свайго жыцця за мяжою я, так сказаць, не парываю сувязі з Радзімай. У гэтым дапамагаюць газеты «Правда» і «Известия», якія я рэгулярна купляю ў кіёсках. Чытаю іх з вялікай цікавасцю. Перасякаючы акіян з дазволам пабываць у СССР, я ўжо меў пэўнае ўяўленне аб зменах, якія адбыліся тут пасля Айчыннай вайны. Але прыехаўшы ў родную Беларусь, я быў нямала здзіўлены — які шырокі крок наперад зрабіла рэспубліка.

Шчасліва і заможна жывуць мае аднавяскоўцы. У многіх з іх пабываў дома і быў вельмі рады за іх лёс.

Разам з землякамі я прымаў удзел ва ўборцы калгаснага сена. Дружная калектыўная праца савецкіх людзей значна адрозніваецца ад працы ў капіталістычнай Аўстраліі. Менавіта радасць працы, сяброўская ўзаемадапамога, таварыскае спаборніцтва — вось тыя рысы, якія я заўважыў на калгаснай сенажаці.

**— Што Вы можаце сказаць аб сваіх планах на будучае?**

— Пабываўшы ў Савецкім Саюзе і зведаўшы сапраўднае шчасце жыць на бацькоўскай зямлі, я бы хацеў вярнуцца з сям'ёй на Радзіму. Думаю, што мяне падтрымаюць у гэтым жонка і дзеці.

**Уладзімір КАЛЕСНІК**

(Працяг. Пачатак у №№ 39, 40).

**Сапраўдныя грамадоўцы сталі ў 1939—41 гадах савецкімі актывістамі, а ў часе акупацыі ўтварылі антыфашысцкае падполле і партызанскія атрады разам з акружэнцамі.** Апошнія былі для мясцовых антыфашыстаў, людзей мірных прафесій, аўтарытэтнымі вайскоўцамі-прафесіяналамі і, галоўнае, савецкімі грамадзянамі, носьбітамі сацыялізму. Часта пад камандаванне былых савецкіх афіцэраў падпольныя антыфашысцкія арганізацыі накіроўвалі сваіх людзей — камуністаў, камсамольцаў, былых грамадоўцаў, беспартыйных грамадзян, верных Савецкай уладзе, яе гуманным прынцыпам. Мясцовыя падпольшчыкі давалі зброю атрадам, апраналі партызан, кармілі іх, інфармавалі аб працыўніку, праводзілі дыверсійныя групы да чыгункі і фашысцкіх гарнізонаў, удзельнічалі ў баях.

**Партызанскі рух у заходніх абласцях Беларусі ўзнікаў як рух народны, рух працоўных мас, сацыялістычны, савецкі па духу і прынцыпах.** Інакш і не магло быць, бо, па-першае, прынцыпы сацыялізму адпавядалі інтарэсам народных мас, якія самі выбралі сабе Савецкую ўладу за паўтара года перад пачаткам вайны; па-другое, ініцыятарамі, арганізатарамі і першымі ўдзельнікамі антыфашысцкага руху і партызанскай барацьбы сталі ў Заходняй Беларусі менавіта камуністы, камсамольцы, савецкія актывісты і проста сумленныя грамадзяне — усе, хто спазнаў за паўтара года Савецкай улады шчасце жыць, працаваць, вучыцца ва ўмовах сацыяльнай справядлівасці.

Сцвярджаю гэта не па кніжках, а на падставе ўласнага жыццёвага вопыту. Мая біяграфія друкавалася ў кнізе «Пра час і пра сябе» (Мінск, 1966 год). Адсылаю туды тых, хто пацікавіцца. Тут хачу падкрэсліць, што меў мажлівасць адчуць і ўсвядоміць хараство сапраўднай таварыскасці, братэрскай добразычлівасці, якая панавала ў Навагрудскім педвучылішчы і ўвасабляла савецкі стыль і лад жыцця. Са сваімі аднакашнікамі я стаў арганізоўваць антыфашысцкае падполле на Міршчыне і па сваёй волі пайшоў у партызаны. Ніхто нас не гнаў сілаю ў падполле і партызанскі атрад, акрамя нашага грамадзянскага сумлення і нянавісці да нялюдскага крывавага фашызму. Мы выйшлі змагацца не проста за ачышчэнне роднай зямлі ад акупанта, а за вызваленне сацыялістычнай Беларусі, за вяртанне таго ладу жыцця, які быў нам любы сваёй справядлівасцю і чалавечнасцю. Нашымі сябрамі былі ўсе, хто раздзяляў гэтыя погляды. Такая была праграма і логіка партызанскага руху ў Заходняй Беларусі.

**Як былы партызан, я з гонарам за сваіх сяброў — савецкіх патрыётаў, антыфашыстаў з-пад Міра, Стаўбцоў і Навагрудка — хачу засведчыць нашым суайчыннікам за мяжой, што не было ў нас аніякіх прынцыповых палітычных разыходжанняў ні з савецкімі воінамі-акружэнцамі, ні, тым больш, з дэсантнікамі.** Апошнія, па якой бы лініі яны ні накіроўваліся ў варожы тыл — ці па лініі вайсковай разведкі, ці па лініі НКВД, ці па лініі ЦК Кампартыі Беларусі і Беларускага ўрада — былі для нас пасланцамі Радзімы, вестунамі з Вялікай зямлі, увасабленнем яе вайсковага, рэвалюцыйнага і палітычнага вопыту. Яны станавіліся нашымі дарадчыкамі і баявымі пабрацімамі. Радысты дэсантных груп штодзённа слухалі голас Радзімы, яе наказы і заклікі, якія мы разам выконвалі і пашыралі сярод насельніцтва. Дэсантнікі перадавалі на Вялікую зямлю інфармацыю пра нашы баявыя справы.

Я асабіста прайшоў у жніўні 1942 года курс мінёра ў камандзіра групы дэсантнікаў у Налібоцкай пушчы маёра Васіля Шчарбіны (псеўданім Барадач). З яго рук браў першую ў сваім жыцці міну, каб узарваць варожы эшалон пад Стоўбцамі. Маёра Барадача любоўна называлі ў нас начальнікам пушчы, і яму добраахвотна падпарадкоўваліся ўсе партызанскія атрады. Гэта ён падтрымаў нашу ініцыятыву стварыць на базе антыфашысцкага падполля баявы атрад у нашых родных мясцінах. Атрад быў створаны ў верасні 1942 года з падпольшчыкаў вёсак Пагарэлка, Лядкі, Беражна, Слабодка, Ператкі, Сіняўская Слабада, Сімакава, Заполле, Пагора, Шчорсы, Ярэмічы, Вобрына, Баўцічы, Скорычы, Загора і інш. Маёр Барадач аказаў нам поўны давер — даручыў выбраць самім камандзіра, камісара, начальніка штаба, камандзіраў рот і ўзводаў. Камандзірам атрада стаў беспартыйны чалавек, старшыня Ператкоцкага сельсавета Стаўбцоўскага раёна Андрэй Саятэвіч, яго намеснікам таксама беспартыйны савецкі актывіст Іван Качановіч, камісарам былы член КПЗБ, палітвязень польскіх турмаў, сялянскі сын з вёскі Сіняўская Слабада Васіль Пазняк, камандзірамі рот — камсамольцы Іван Мацко з Пагарэлкі і Яўген Крамко з Беражна. Мне даверылі тады сябры стаць камандзірам узвода, пазней — начальнікам штаба атрада. Насельніцтва назвала наш атрад Камсамольскім. Партызаны прынялі і з гонарам насілі гэту назву. У 1943 годзе атрад перарос у брыгаду «Камсамолец» Баранавіцкага злучэння. Больш як восемдзесят працэнтаў брыгады складалі беларусы, мясцовыя жыхары. І ні ў кога з нас не было нават ценю тых агідных антысавецкіх комплексаў, з якімі лётаў па кустах і цяпер носіцца па свеце пан Таўпека.

# ПОД СОЛНЦЕМ ГРУЗИИ

Гиви ДЖАВАХИШВИЛИ,
Председатель
Совета Министров
Грузинской ССР

●

В прошлом году мы торжественно отметили 50-летие установления Советской власти и образования Коммунистической партии Грузии. Это событие было праздником всей страны, ибо праздник одного народа, одной республики становится торжеством для трудящихся всей нашей Родины. Это великое завоевание нового социалистического строя.

За пятьдесят лет Грузия из угнетенной, полуколониальной страны превратилась в республику гидроэлектростанций, большой металлургии, высокоразвитого машиностроения и легкой промышленности, многоотраслевого сельского хозяйства, передовой науки и культуры. Это стало возможным благодаря самоотверженной помощи всех братских советских народов.

В исключительно тяжелые для всей страны годы борьбы с разрухой и голодом москвичи безвозмездно передают в дар городу Кутаиси, ныне второму промышленному центру республики, оборудование для суконной фабрики. По указанию Владимира Ильича Ленина правительство РСФСР из своего бюджета выделяет молодой республике 750 тысяч рублей золотом на строительство первой в Грузии гидроэлектростанции в Земо-Авчала, неподалеку от Тбилиси. Турбины для нее изготовили рабочие Ленинграда.

Мирный труд советских людей был прерван вероломным нападением фашистской Германии. 673 тысячи сынов Грузии вместе с миллионами братьев из других республик громили гитлеровские полчища под Москвой и Сталинградом, на подступах к Кавказу и под Киевом, на Висле и Одере, штурмовали Берлин...

В справочнике-путеводителе по Тбилиси, изданном в начале двадцатых годов, говорится, что большинство предприятий города носит кустарный характер. Они выпускали табачные изделия, мыло, кожевенные товары. Это говорилось о столице республики. А что же было в провинциальных городах?

Сегодня картина иная. Сталь, чугун и прокат, автомобили, магистральные электровозы, универсальные станки, машины для чайной и винодельческой промышленности, точные приборы, быстроходные суда на подводных крыльях — все это производится в Грузии. Около 300 наименований грузинских изделий экспортируется в 70 стран мира. Наряду с традиционными товарами экспорта — чаем, вином, коньяками — значительное место занимают станки с программным управлением, компьютеры, электронно-измерительная аппаратура.

В дореволюционной Грузии, аграрном придатке царской России, крестьянин обрабатывал пашню с помощью сохи и плуга. Сегодня на полях республики работают десятки тысяч тракторов и комбайнов, а на чайных плантациях — первые в мире чаеуборочные машины «Сакартвело».

В успешном осуществлении социально-экономической программы, разработанной XXIV съездом КПСС, решающее значение придается дальнейшему развитию промышленного производства. Намечены серьезные сдвиги в структуре таких отраслей, как электроэнергетика, неметаллоемкие отрасли машиностроения и химическая промышленность. Причем этот рост произойдет преимущественно за счет более высокой производительности труда, повышения эффективности производства, ускорения научно-технического прогресса.

С вводом в строй уникальной Ингури-ГЭС с высотной арочной плотиной производство электроэнергии увеличится в 1,7 раза.

В девятой пятилетке на базе Маднеульского месторождения в восточной части республики, которое хранит богатые залежи медной руды, барита, свинца, серы, цинка, появится центр грузинской цветной металлургии — Маднеули. Уже строятся горнообогатительный комбинат и современный город, где будут жить 25 тысяч человек.

В западной Грузии запланировано расширить одну из старейших отраслей черной металлургии — марганцевую промышленность.

Высокие темпы развития намечены в машиностроении. Объем промышленной продукции станкостроения и инструментальной промышленности вырастет почти вдвое, электротехнической —в 1,6 раза, производство приборов и средств автоматизации — более чем в три раза. В два раза будет увеличен выпуск сельскохозяйственных машин.

За пятилетку намечено расширить сады, виноградники и чайные плантации более чем на 65 тысяч гектаров. Труженики получат 70 тысяч гектаров новых поливных земель и 50 тысяч гектаров осушенных земельных площадей.

Большие задачи решают ученые. Ведутся научные исследования в области вычислительной техники, математики, ядерной физики, кибернетики, астрономии, биологии... Ученые проведут значительные работы по комплексному изучению и использованию местной сырьевой базы.

Намечено дальнейшее повышение материального благосостояния и культурного уровня жизни народа. Реальные доходы на душу населения заметно увеличатся, а денежные доходы по сравнению с 1970 годом повысятся на 41,6 процента.

В Грузии, как и во всей стране, в течение пятилетки будет завершен переход к всеобщему среднему образованию.

Пройдет много лет. Нынешний юбилейный год в жизни Советского Союза станет далеким прошлым. Цифры, с которыми мы вступаем во вторую половину столетия образования СССР, тоже станут достоянием истории. Но их не забудут. Эти цифры будут изучаться нашими потомками для того, чтобы лучше оценить достижения страны, темп ее жизни. И они по праву будут гордиться свершениями нынешнего поколения советских людей.

**Самая крупная электростанция Якутии построена в 1970 году возле поселка Чернышевский на правом берегу реки Вилюй. Станция дает дешевую электроэнергию предприятиям местного алмазодобывающего комплекса. Вилюйская ГЭС— первое в мире гидротехническое сооружение, построенное в условиях труднодоступной местности, сурового климата и вечной мерзлоты. Каждый ее агрегат размещен в высеченных скальных шахтах. Сквозь скалы пролегают и напорные магистрали, по которым вода идет к турбинам. Напор воды сдерживает плотина, поднявшаяся на 80 метров.**

**НА СНИМКАХ: так будет выглядеть станция с пуском второй очереди; гостиница энергетиков «Теремок»; профилактический ремонт четвертой турбины ГЭС.**

**Фото ТАСС.**

---

Разам з дэсантнікамі мы з дня ў дзень змагаліся супраць фашызму — заклятага ворага чалавецтва. З якой жа рацыі нам было баяцца дэсантнікаў, а ім не давяраць нам ці прыдзірацца да нас? Канешне, людзі не анёлы, а партызанскі лес не райскі сад. Маглі быць у кагонебудзь асабістыя антыпатыі, канфлікты, але гэта чалавечае, а не грамадскае. **Як грамадзяне мы раслі ідэйна і палітычна ў супольным жорсткім змаганні, нас парадніла разам пралітая кроў у баях з фашыстамі. Многія з нас, і я ў тым ліку, сталі ў атрадзе камсамольцамі і камуністамі.** Прыём у камсамол і партыю ўсе мы лічылі за гонар і прызнанне, якія аказвала нам самая прагрэсіўная палітычная сіла сучаснасці, увасабляючая сацыялістычны гуманізм, сацыяльную і нацыянальную роўнасць і справядлівасць.

Падобным чынам уладкоўваліся ўзаемаадносіны паміж мясцовымі партызанамі і вайскоўцамі, а таксама дэсантнікамі ў Ружанскіх, Гуцінскіх, Булінскіх і Ваўчанорскіх лясах, пра якія бае страхотлівыя байкі Таўпека.

Паслухаем радавога ўдзельніка падзей — перадваеннага старшыню Харэўскага сельсавета Ружанскага раёна Мікалая Стручыстага, партызана атрада імя Кірава брыгады імя Панамарэнкі. З першых дзён акупацыі, па яго словах, на Ружаншчыне ўзніклі партызанскія групы, якімі камандавалі лейтэнанты Гарлзнаў, Аляксандр Журба і Іван Лабуда. Групы папоўніліся мясцовымі людзьмі. Асабліва актыўна пайшла ў атрады мясцовая моладзь, калі разнеслася чутка, што з-за лініі фронту вярнуўся вядомы на ўсю акругу рэвалюцыянер Язэп Урбановіч у якасці пасланца ЦК КПБ.

Перад зімой 1941 года карнікам удалося разбіць некаторыя партызанскія групы. Уцалеўшыя партызаны зімавалі на хутарах і ў вёсках пад апекай верных Савецкай уладзе сялян. Вясной 1942 года зноў у лясах сфарміравалася некалькі атрадаў, якія ўзмоцнілі барацьбу. Між іншым, паказальна, што не лясы, а паселішчы былі найбольш зручным месцам схованкі. Для сапраўдных партызан лес — гэта база, дзе ў адносным бяспецы і ў сакрэце ад ворага можна навучаць людзей вайсковай справе, гартаваць палітычна, прышчапляць дысцыпліну, планаваць і рыхтаваць баявыя аперацыі. Партызанскі лес — баявы рубеж. Толькі для Таўпекі ён быў сховішчам ад страху, а потым стаў месцам палітычных спекуляцый, якія скончыліся ганебным правалам.

Выдатную ролю ў арганізацыі і палітычным кіраўніцтве антыфашысцкім і партызанскім рухам на Ружаншчыне, Косаўшчыне і Слонімшчыне, у Гуцінскіх, Булінскіх і Ваўчанорскіх лясах адыгралі прысланыя з-за лініі фронту дэсантныя групы.

Першынство належыць тут групе дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Івана Жышко, накіраванай на Ружаншчыну ЦК КПБ і ўрадам Савецкай Беларусі 30 ліпеня 1941 года з Гомеля. У яе ўваходзіў старшыня Ружанскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Язэп Урбановіч. Ветэран рэвалюцыйнага руху, арганізатар гурткоў Грамады на Ружаншчыне, кіраўнік віленскага камсамола, сакратар Баранавіцкага і Брэсцкага акруговых камітэтаў КПЗБ у 30-я гады, вязень польскіх турмаў, ён стаў ініцыятарам утварэння шырокага падпольнага антыфашысцкага руху ў адзінаццаці раёнах Брэсцкай, Гродзенскай і Беластоцкай абласцей. Арганізацыя называлася Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі, пазней Антыфашысцкі камітэт Брэсцкай вобласці. Яго структура нагадвала былую КПЗБ. Сакратаром камітэта быў абраны Язэп Урбановіч, яго намеснікам па справах прапаганды вопытны рэвалюцыянер, былы інструктар ЦК КПЗБ па нацыянальным пытанні, ураджэнец вёскі Піняты Ружанскага раёна Мірон Крыштафовіч. Членамі камітэта сталі былы начальнік Камянецкага раённага аддзела НКВД, ленінградзец, настаўнік па адукацыі, камуніст Яўген Афанасьеў і вядомы нам Іван Жышко. Пэўны час у кіраўніцтва Камітэта ўваходзілі лейтэнант Журба і батальённы камісар Ягораў. **Ужо склад кіраўніцтва паказвае на інтэрнацыянальны і савецкі характар яго дзейнасці. Камітэт стаў органам каардынацыі дзеянняў партызан, цэнтрам палітычнага кіраўніцтва партызанскім рухам у зоне і антыфашысцкай агітацыі сярод насельніцтва.**

Камітэт павёў барацьбу з праявамі палітычнага верхаглядства і безадказнасці. На пасяджэнні 1 ліпеня 1942 года была раскрытыкавана лістоўка, выпушчаная на сваю руку нейкім Уладзімірам Гарбуновым, які пачаў выкалупваць памылкі даваенных служачых савецкіх дзяржаўных устаноў, вінавацячы іх за тое, што яны, нібыта, астудзілі сімпатыі насельніцтва да Савецкай улады. Пазіцыя аўтара лістоўкі была асуджана Камітэтам як варожая, шкодная антыфашысцкаму руху. Самадзейны агітатар прыняў часовую разгубленасць насельніцтва ў пачатку акупацыі за пасіўнасць і ахаладжэнне да Савецкай улады. Дабыўшы ў партызанах да вызвалення, ён не раз мог пераканацца ў памылковасці сваіх паспешлівых меркаванняў.

На пасяджэнні Камітэта 10 ліпеня 1942 года было вырашана правесці рэгістрацыю ўсіх камуністаў і камсамольцаў у атрадах, былі ўведзены пасады палітрукоў, быў зацверджаны тэкст прысягі, якую павінен быў прымаць кожны партызан асабіста. Камітэт разгарнуў шырокую антыфашысцкую агітацыю ў зоне дзеяння: абсталяваў друкарню, публікаваў адозвы, лістоўкі, адрасаваныя розным групам насельніцтва, пазней выдаваў сваю падпольную газету «За Родину».

У адозве пад назвай «Бі немца-сатану», надрукаванай Камітэтам у лістападзе 1942 года, гаворыцца:

«Беларус і паляк! Выкрывай нямецкіх шпіёнаў і знішчай іх! Яны пайшлі на службу да ворага свайго народа, да чужаземца-немца і дапамагаюць яму забіваць, грабіць і здзекавацца са свайго народа... Бі немца-сатану, ударыш у Беларусі — лягчэй будзе на Дану!»

У чэрвені 1943 года камітэт выдаў «Загад па часова акупіраванай тэрыторыі Брэсцкай вобласці БССР», у якім, між іншым, гаворыцца:

«Усім жыхарам пад пагрозай расстрэлу забараніць служыць у нямецкай арміі, паліцыі і так званых беларускіх корпусах і групах самааховы.

Усе асобы, паступіўшыя на службу да гітлераўскіх катаў, а таксама рознага роду падбрэхічы аб'яўляюцца здраднікамі Радзімы і падлягаюць неадкладнаму расстрэлу.

Выкананне загаду ўскладаецца на партызанскія атрады».

Вось чаго баяўся і ад каго ўцякаў пан Таўпека — ад народнага антыфашысцкага руху. Пры чым жа тут дэсантнікі НКВД?

**(Працяг будзе).**

# СУПРАЦЬ ТЭНДЭНЦЫЁЗНАСЦІ І ДЭЗІНФАРМАЦЫІ

**Французскі друк апублікаваў распаўсюджаны агенцтвам Франс Прэс тэкст пісьма пасла СССР у Францыі П. АБРАСІМАВА першаму сакратару Французскай сацыялістычнай партыі Ф. МІТЭРАНУ, у якім даецца водпаведзь антысавецкай і антыкамуністычнай кампаніі, разгорнутай у апошні час рэакцыйнай прапагандай у Францыі.**

ПАН першы сакратар,

Павінен сказаць, што мяне здзівіла Ваша пісьмо ад 25 жніўня г.г. Вы спасылаецеся ў ім на «інфармацыю, сапраўднасць якой не можа быць пастаўлена пад сумненне». Мы разлічвалі, што ў выпадку ўзнікнення ў Вас пытанняў, якія датычаць Савецкага Саюза, Вы перш за ўсё звернецеся ў наша пасольства з тым, каб атрымаць неабходныя тлумачэнні, перш чым выступаць з публічнымі нападкамі ў адрас Савецкага Саюза.

Цяпер аб сутнасці справы. Адразу агаваруся, што гэта наша ўнутранае пытанне, і таму я мог бы наогул пакінуць Ваша пісьмо без адказу. Улічваючы, аднак, узнятую на Захадзе шуміху і прапагандысцкую мітусню вакол гэтага пытання, хацеў бы паведаміць Вам наступнае:

Вы, пан першы сакратар, гаворыце аб «новых дыскрымінацыйных мерах у адносінах да краіны або не вяртацца на радзіму».

Як вядома, не толькі СССР, але і многія іншыя краіны ставяць і вырашаюць у сябе пытанні, звязаныя з так званай «уцечкай мазгоў». Наколькі вядома, гэта датычыць і Францыі, дзе дзейнічае інструкцыя аб тым, што асобы, якія скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы агульнанацыянальнага значэння, абавязаны працаваць на працягу некалькіх (аж да 10) год у адпаведнасці з дзяржаўным назначэннем, а ў выпадку пакідання работы — пакрыць дзяржаве расходы, затрачаныя на іх навучанне.

Хацеў бы звярнуць Вашу ўвагу яшчэ на адну акалічнасць. Не Савецкі ўрад, а менавіта Вы, пан першы сакратар, спрабуеце штучна падзяліць савецкіх людзей па нацыянальнай прыкмеце. За 50 год існавання Савецкага Саюза мы прывыклі разглядаць усіх жыхароў СССР перш за ўсё як савецкіх грамадзян, якія маюць незалежна ад нацыянальнасці і роўныя правы і роўныя абавязкі. Сам я беларус па нацыянальнасці, але калі б незнаёмы іншаземец задаў мне пры першай сустрэчы пытанне: «Хто вы?», я б адказаў: «Савецкі грамадзянін». Чаму ж Вы так старанна і нават надакучліва імкнецеся выдзеліць яўрэяў з агульнай сям'і савецкіх грамадзян, дабіваецеся нейкай выключнасці для іх, ледзь не асобных правоў? Наша Канстытуцыя ўстанавіла поўнае раўнапраўе грамадзян СССР незалежна ад іх нацыянальнасці і расы.

Паколькі Вы закранулі становішча яўрэяў у Савецкім Саюзе ў галіне адукацыі, у тым ліку вышэйшай, я хацеў бы прывесці некаторыя лічбы, якія апублікаваны, але старанна замоўчваюцца варожай нам прапагандай.

Права на атрыманне вышэйшай адукацыі ў Савецкім Саюзе маюць грамадзяне ўсіх нацыянальнасцей. Фактычна ў 1970/71 навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах СССР навучалася: рускіх — 2 мільёны 700 тысяч студэнтаў (агульная колькасць рускіх 129 мільёнаў чалавек); украінцаў — 621 тысяча студэнтаў на насельніцтва 40,7 мільёна чалавек; беларусаў—130 тысяч студэнтаў на насельніцтва 9 мільёнаў чалавек; узбекаў — 150 тысяч студэнтаў на насельніцтва 9 мільёнаў чалавек; яўрэяў — 105 тысяч студэнтаў на насельніцтва 2,2 мільёна чалавек; армян — 81 тысяча студэнтаў на насельніцтва 3,5 мільёна чалавек; латышоў — 21 тысяча студэнтаў на насельніцтва 1,4 мільёна чалавек.

Такім чынам, адзін студэнт-рускі прыпадае на 47 чалавек рускага насельніцтва; адзін студэнт-украінец — на 65,5 украінцаў; адзін студэнт-беларус —на 69 беларусаў; адзін студэнт-яўрэй — на 21 чалавека яўрэйскага насельніцтва. Значыць, прапорцыя яўрэяў у вышэйшых навучальных установах у 2—3 разы большая, чым у рускіх, украінцаў, беларусаў. Чаму ж Вы не гаворыце аб «дыскрымінацыі» рускіх, украінцаў, беларусаў?

Гэтыя лічбы вельмі паказальныя. Яны даказваюць, што ў адносінах да яўрэяў у нас няма ніякай дыскрымінацыі, што ў Савецкім Саюзе існуе сапраўднае раўнапраўе нацыянальнасцей.

Такім чынам, Ваша заява, апублікаваная з такой паспешнасцю, нават без ценю спробы высветліць сапраўдныя акалічнасці, скажае становішча ў Савецкім Саюзе, вытрымана ў варожым тоне і не можа не выклікаць у нас пратэсту. Таму я адхіляю яе і па сутнасці, як зусім не адпаведную сапраўднасці, і па форме, як спробу ўмяшання ва ўнутраныя справы СССР.

Хацеў бы я таксама звярнуць увагу на тэндэнцыёзнасць Вашага падыходу і ў другім пытанні — у ацэнцы адносін паміж СССР і Чэхаславакіяй. Сваю прэс-канферэнцыю 21 жніўня Вы пачалі са сцвярджэння аб так званай «савецкай інтэрвенцыі» ў Чэхаславакіі ў 1968 годзе. Ад гэтага збітага тэзіса, разумеючы яго негрунтоўнасць, пачынае паступова адыходзіць нават буржуазная прапаганда. Я магу напомніць у гэтай сувязі нядаўні артыкул «Гадавіна» ў газеце «Монд», у якім справядліва ўказвалася, што савецкія людзі пралілі вельмі многа крыві дзеля адраджэння чэхаславацкай дзяржавы, каб хоць на міг дапусціць думку аб магчымасці параўноўваць 1938 год з 1968 годам, а таксама ўказвалася, што шуміха вакол «чэхаславацкага пытання» заклікана адцягнуць увагу грамадскасці ад становішча ў іншых раёнах свету, напрыклад, у В'етнаме.

Па меры таго, як нармалізуецца становішча ў ЧССР, становіцца ўсё больш відавочным пазітыўны характар акцыі братніх сацыялістычных краін па аказанні дапамогі ЧССР у абароне сацыялістычнага ладу ў 1968 годзе. XIV з'езд Камуністычнай партыі Чэхаславакіі ахарактарызаваў гэтую дапамогу як акт інтэрнацыянальнай салідарнасці. Можа выклікаць толькі здзіўленне тая настойлівасць, з якой Вы спрабуеце падграваць антысавецкія пачуцці ў гэтым пытанні.

У святле Вашых заяў як аб становішчы асоб яўрэйскай нацыянальнасці ў СССР, так і па «чэхаславацкім пытанні» ў мяне, шчыра кажучы, узнікае сумненне адносна шчырасці Вашых запэўненняў аб пажаданасці ўстанавіць і развіваць кантакты з кіраўніцтвам Савецкага Саюза, у тым ліку шляхам асабістых сустрэч. Вашы намеры працягваць бударажыць некаторыя штучна створаныя пытанні сведчаць аб імкненні на хвалі антысаветызму прадэманстраваць сваю «актыўнасць» і прыцягнуць да сябе ўвагу. У нашым уяўленні такога роду «актыўнасць» можа толькі паставіць пад сумненне своечасовасць Вашай паездкі ў СССР, на якую раней, у адпаведнасці з Вашай просьбай, была дадзена згода.

Павінен адзначыць, што я, пачынаючы з панядзелка 28 жніўня, неаднаразова спрабаваў звязацца з Вамі па тэлефоне, з тым каб сустрэцца і перагаварыць па гэтых пытаннях. На жаль, мае спробы аказаліся безвыніковымі.

У сувязі з тым, што Вы, пан першы сакратар, зрабілі Вашу заяву публічнай, я вымушан, як Вы разумееце, перадаць у друк і мой адказ з тым, каб не даць магчымасці пэўным, добра вядомым Вам колам спекуляваць на гэтых пытаннях.

З павагай

**П. АБРАСІМАЎ.**

# ГОЛАС АСАБЛІВЫ І НЕПАЎТОРНЫ

Творчасць Янкі Купалы ведаюць ва ўсіх кутках Савецкай краіны. Таму святам усёй нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры стала 90-годдзе з дня нараджэння песняра.

На ўрачысты вечар у Маскве, прысвечаны народнаму паэту Беларусі, у Калонную залу Дома Саюзаў прыйшлі пісьменнікі сталіцы, рабочыя маскоўскіх прадпрыемстваў, шматлікія паклоннікі светлага таленту Янкі Купалы. У прэзідыуме сходу — вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, вучоныя, пасланцы брацкіх рэспублік, прадстаўнікі грамадскасці. Прысутныя цёпла сустрэлі дэлегацыю Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале з Максімам Танкам.

Ад імя Саюза пісьменнікаў СССР, Саюза пісьменнікаў і Міністэрства культуры Беларусі вечар адкрыў уступным словам Герой Сацыялістычнай Працы, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР М. Ціханаў.

— Уся наша краіна, — сказаў ён, — рыхтуецца да пяцідзесяцігоддзя ўтварэння СССР. Напярэдадні гэтага слаўнага юбілею сярод выдатных імён мы з гордасцю называем імя Янкі Купалы, які сваёй паэзіяй унёс велізарны ўклад у духоўнае жыццё беларускага народа, прайшоўшы з ім увесь доўгі шлях барацьбы за чалавека сацыялістычнага свету.

Янка Купала — заснавальнік новай беларускай літаратуры, разам з Якубам Коласам па сіле свайго таленту з'яўляецца выразнікам найглыбейшых народных дум, заслужана носіць званне народнага паэта Беларусі.

Ён раскрыў нам у сваіх творах беларускія зялёныя прасторы, і мы зведваем пачуццё гордасці і сардэчнага хвалявання за гэтыя прасторы, за беларускі народ.

Не бяднее на мастакоў слова зямля вялікага Савецкага Саюза. Але якой бы ні была яна багатай сваімі нацыянальнымі паэтамі, сярод самых таленавітых і значных заўсёды будзе гучаць асаблівы і непаўторны голас бессмяротнага Янкі Купалы.

«Слова пра Янку Купалу» сказаў старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Максім Танк.

— Янка Купала разам са сваім сябрам Якубам Коласам стаў заснавальнікам сучаснай беларускай літаратуры, — сказаў прамоўца.— Час, калі паэт з'явіўся на свет, не быў, як вядома, спрыяльны ні для жыцця, ні для песень. Тым не менш, мы можам сцвярджаць, што прыход Купалы ў літаратуру быў і застаецца з'явай, перад якой мы і сёння спыняемся ў захапленні і здзіўленні. Ён належыць да таго сузор'я сусветных паэтаў, якія былі ўладарамі душ. Паэзія Купалы адыграла велізарную ролю ў фарміраванні нацыянальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай свядомасці беларускага народа, з жыццём якога непарыўна ён быў звязаны.

Значэнне Купалы і Коласа велізарнае яшчэ і таму, што яны вывелі беларускую літаратуру з глухамані палявых дарог на шырокі шлях рэвалюцыі, якая залпам «Аўроры» абвясціла свету аб доўгачаканай свабодзе.

Купалу і Коласа мы называем заснавальнікамі сучаснай беларускай літаратуры. І сапраўды, няма такіх жанраў, у якіх бы яны не пакінулі нам сваіх выдатных твораў, будзь гэта паэзія ці драматургія, проза ці сатыра, або палымяная публіцыстыка гадоў Айчыннай вайны.

Сёння мы заканамерна гаворым аб узаемаўплыве і ўзаемаўзбагачэнні нашых брацкіх літаратур. Творчасць Купалы з'яўляецца яскравым прыкладам гэтаму. Яна развівалася, убіраючы ў сябе жывую плынь шматлікіх крыніц: ад народных песень да твораў сусветнай класікі, да паэзіі сучаснікаў.

Аб вечным значэнні творчасці Янкі Купалы гаварылі ў гэты вечар украінец Мікола Бажан, літовец Эўгеніюс Матузявічус, грузін Хута Берулава, ад пісьменніцкай арганізацыі Татарыі — Рэнат Харысаў. Руская паэтэса Марыя Камісараза чытала вершы, прысвечаныя Янку Купалу. Іх словы ў гонар сына Беларусі гучалі як гімн дружбе і брацтву савецкіх народаў.

**П. КАСАЛАПАЎ.**

# СЁННЯ

**У ціхім пакоі музея «Беларусьфільма» на нас глядзяць са сцен фотаздымкі далёкіх год. Тут уся гісторыя беларускага кіно. Вось афіша першай карціны, створанай у 1926 годзе, — «Лясная быль». Вось кадры з фільмаў «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Чырвонае лісце», «Горад майстроў», «Праз могілкі», «Альпійская балада»... У зашклёных стойках-вітрынах — прызы і дыпломы, атрыманыя на розных фестывалях.**

**У калідорах студыі — таблічкі з назвамі карцін, якія здымаюцца зараз. А вось дзверы з надпісам: «У. Корш-Саблін». Тут пакой старэйшага беларускага кінарэжысёра, які паставіў фільмы «У агні народжаная», «Першы ўзвод», «Шукальнікі шчасця», «Канстанцін Заслонаў», «Чырвонае лісце», «Крушэнне імперыі» і іншыя. Народны артыст СССР Уладзімір Корш-Саблін — мастацкі кіраўнік творчага аб'яднання мастацкіх фільмаў, першы сакратар Саюза кінематаграфістаў БССР. Зойдзем да яго.**

**— Уладзімір Уладзіміравіч, Вы на беларускай студыі з часоў стварэння першага фільма, у якім самі здымаліся і былі асістэнтам рэжысёра. Наколькі, на Ваш погляд, адчуваюцца ў беларускім кіно апошніх год гераічныя традыцыі «Лясной былі»?**

— Героіка -патрыятычная тэма з'яўляецца вядучай у беларускай кінематаграфіі на працягу ўсіх год яе існавання. Буйныя гістарычныя канфлікты, паказаныя праз лёс чалавека, адбіліся, у прыватнасці, і ў маім апошнім фільме «Крушэнне імперыі» (сцэнарысты М. Блейман і М. Каварскі). Час дзеяння—пярэдадзень Вялікага Кастрычніка. Я імкнуўся паказаць, як у занядбанай, жабрацкай Расіі адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя — фаза, пасля якой наступіла Кастрычніцкая рэвалюцыя.

**— З Вамі разам над фільмам працаваў малады рэжысёр М. Калінін?**

— Так, ён быў маім супастаноўшчыкам. А потым ён самастойна паставіў «Рудабельскую рэспубліку». Гэта карціна пра гераічны край. У Рудабелцы ніколі не было акупантаў, над ёй не апускаўся чырвоны флаг, падняты ў кастрычніку 1917 года. Праўда, цяжкасці адчуваліся з пошукамі натуры. Сучасная Рудабелка — пасёлак новабудоўляў. У прынёманскім краі, на Гродзеншчыне, была зной-

Вакальны ансамбль Хімаўскага сельскага дома культуры Бабруйскага раёна. Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

# ЖЫВЫЯ ЛЯЛЬКІ

— Жывыя лялькі? — здзівіцца чытач. Дзе іх можна ўбачыць?

Але менавіта такое ўражанне застаецца ў тых, хто пабывае на спектаклях Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, тэатра цікавага і незвычайнага.

— Незвычайнасць лялечнага тэатра, — гаворыць галоўны рэжысёр Анатоль Ляляўскі, — вынікае са спецыфікі нашага мастацтва. У іншых відах тэатральнага жанру ад акцёра патрабуецца ўменне пераўвасобіцца, увайсці, ужыцца ў сваю ролю, і ўсё ж ён застаецца самім сабой. У нас жа артыст перадае задуму аўтара, свае думкі, пачуцці пры дапамозе пабочнага прадмета — лялькі. Ды і сама лялька хавае ў сабе незвычайнасць. Яна нібы парадокс: нежывая матэрыя, якая павінна ажыць у руках акцёра.

Тэатр лялек — гэта тэатр для іншых гледачоў. Трэба адзначыць, што спектаклі рыхтуюцца з улікам узросту дзяцей. Напрыклад, самым маленькім не варта паказваць п'есу з «драматычнымі» падзеямі. Дзеці вельмі даверлівыя, і калі воўк на вачах у іх з'есць Чырвоную Шапачку, то гэта для іх будзе, бадай, большая трагедыя, чым «Рамео і Джульета» для дарослых. А вось старэйшым ужо можа быць «крыху страшна».

І яшчэ адна асаблівасць дзіцячага лялечнага тэатра — абавязковая прысутнасць у спектаклі смелага, добрага, справядлівага героя. Тэатр — выдатны выхавацель. Маленькі глядач прыходзіць сюды, каб убачыць казку. Але разам з займальным сюжэтам ён убірае ў сябе ідэі дабра і справядлівасці, вучыцца спачуваць пакрыўджаным, абараняць слабых. Між іншым, у штаце лялечнага тэатра ёсць прафесійныя педагогі. Іх думка абавязкова ўлічваецца пры падборы рэпертуару. Педагогі наладжваюць з дзецьмі абмеркаванне прагледжаных спектакляў, арганізуюць выстаўкі дзіцячых малюнкаў, падтрымліваюць сувязь з дзіцячымі садамі, школамі, піянерскімі лагерамі.

Ёсць у тэатры і спектаклі для дарослых: «Боская камедыя», «Прыгожая Галатэя», «Скарбы Сільвестра» і іншыя. Днямі адбылася прэм'ера спектакля-балета для дарослых «Жар-птушка» (музыка І. Стравінскага). Безумоўна, лялечны балет не паўтарае сапраўдны. Ён выкарыстоўвае толькі асобныя балетныя элементы. Але тое, што не можа зрабіць жывы артыст, лёгка выканае лялька.

Некалькі слоў пра тэхнічны бок гэтага спектакля. Уся сцэна пакрыта чорным аксамітам, героі, таксама ў чорным, знаходзяцца тут жа, на сцэне, а не за шырмай, як звычайна. Але дзякуючы чорнаму колеру іх адзення і сцэны глядач бачыць толькі лялькі, якія асветлены. Ствараецца ўяўленне, нібыта падзеі адбываюцца ў аб'ёмнай прасторы.

У спектаклях заняты вопытныя акцёры: заслужаныя артысты БССР У. Калашнікаў, В. Уласаў, артысты Л. Мікула, І. Жыткевіч, А. Шкілёнак, В. Пакрашынская, В. Зельскі, В. Грамовіч. Многа ў тэатры моладзі.

Уладзімір Калашнікаў у час Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у мінскай падпольнай арганізацыі. Семнаццацігадовы юнак быў сувязным, дапамагаў вырабляць фіктыўныя «аўсвайсы». У 1947 годзе Калашнікаў паступіў у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. У час вучобы працаваў рабочым сцэны ў оперным тэатры. Пасля заканчэння інстытута прыйшоў у тэатр лялек.

— Невялікай групе энтузіястаў, якой кіраваў С. Аркадзьеў, — успамінае Уладзімір Аляксандравіч, — даводзілася самім рабіць лялькі, быць і мастакамі, і музыкантамі, і краўцамі, і бутафорамі.

У першым спектаклі тэатра — беларускай народнай казцы «Дзед і жораў» — Уладзімір Калашнікаў выконваў ролю дзеда. Дарэчы, спектакль палюбіўся і гледачам і артыстам і да гэтага часу ўваходзіць у рэпертуар тэатра. За плённую працу ў тэатры лялек У. Калашнікаў удастоены звання заслужанага артыста рэспублікі.

А вось творчая біяграфія самага маладога артыста тэатра Сяргея Юркевіча.

— Яшчэ калі я вучыўся ў пачатковай школе, — расказвае Сяргей, — да нас у Маладзечна прыехаў на гастролі тэатр лялек. Я хадзіў на кожны спектакль. Асабліва мне падабаўся «Кот у ботах». А аднойчы мяне правялі за кулісы, і я ўбачыў, як працуюць акцёры. І ўжо тады вырашыў: стану лялечнікам. Спачатку займаўся ў самадзейным тэатры лялек пры Доме чыгуначнікаў у Маладзечна. У 1968 годзе прыехаў у Мінск, працаваў рабочым сцэны, а затым стаў акцёрам...

За 21 год свайго існавання тэатр паставіў каля 100 п'ес. Гэта творы беларускіх, рускіх і зарубежных аўтараў.

На прадстаўленнях тэатра пабывала больш за шэсць мільёнаў гледачоў.

Калектыў часта выязджае на гастролі ў Літву, Латвію, на Украіну, у РСФСР, а што датычыць Беларусі, то тут, бадай, не засталося раёна, дзе б ні пабывалі артысты. Вось і зараз група артыстаў гастралюе на Гродзеншчыне.

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек пачаў свой 22-гі сезон. У рэпертуарным плане шмат цікавага і для дзяцей, і для дарослых. Сярод прэм'ер, якія ўбачыць глядач у хуткім часе, — «Залаты конь» па п'есе Яна Райніса. Гэты спектакль калектыў рыхтуе да 50-годдзя ўтварэння СССР.

**У. КАЗЫРЫН.**

## хроніка культурнага жыцця

*УКАЗАМ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за выдатныя заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і плённую грамадскую дзейнасць народнаму паэту Беларусі Петрусю Броўку прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем яму ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і молат».*

*НА ЧАРНІГАЎШЧЫНЕ адбыўся Тыдзень беларускай літаратуры. Беларускія пісьменнікі Р. Барадулін, С. Шушкевіч, Р. Няхай, К. Камейша, Хв. Чэрня, В. Ярац сустрэліся з працоўнымі горада і вёскі. Яны расказалі аб дасягненнях беларускай савецкай літаратуры, падзяліліся творчымі планамі.*

*З візітам у адказ на Гомельшчыну прыедуць пісьменнікі з Украіны.*

*У МІНСКУ, на вуліцы Чкалава, адкрыўся новы кніжны магазін. Цяпер у горадзе 24 кнігарні, дзесяць з якіх — спецыялізаваныя, 82 кіёскі, якія гандлююць літаратурай. Штогод кожны мінчанін купляе кніг на 5 рублёў 47 капеек.*

*КАЛЕКТЫЎ Маскоўскага цырка на сцэне пабываў у гасцях у земляробаў калгаса «Радзіма» Гродзенскага раёна. Выступленні цырка адбыліся таксама ў калгасах імя Чапаева, «Слава працы» Дзятлаўскага, імя Чарняхоўскага Карэліцкага, «Шлях Леніна» Іўеўскага, імя Кірава Воранаўскага, «Рассвет» і «Звязда» Навагрудскага раёнаў.*

*За два месяцы гастроляў маскоўскія артысты далі для беларускіх сялян больш за 50 прадстаўленняў, на якіх пабывала каля 30 тысяч чалавек.*

*КОЖНЫ экспанат Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — яркая старонка гераічнай барацьбы народа з фашысцкімі захопнікамі. Нядаўна тут падрыхтавана выстаўка «Сыны братніх народаў у баях за Беларусь», прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР. Выстаўка перасоўная. Яна будзе паказана на некаторых прадпрыемствах Мінска.*

# НА «БЕЛАРУСЬФІЛЬМЕ»

дзена вёска Прывалкі, удала «загрыміраваная» пад Рудабелку, і эфектны «панскі маёнтак». А рабочыя саўгаса сыгралі ў масоўках сялян і казакоў.

**— Ці плануе студыя працягваць гісторыка-рэвалюцыйную тэму?**

— Якраз нядаўна запушчаны ў вытворчасць сцэнарый І. Шамякіна «Трыццаць шэсць вагонаў». У аснове яго — рэальны факт: пасылка па дырэктыве У. І. Леніна эшалона з хлебам для рускіх ваеннапалонных у Германіі.

**— Уладзімір Уладзіміравіч, студыю «Беларусьфільм» часам называюць «Партызанфільм», паколькі лепшыя яе творы — пра вайну, пра партызанскі рух, пра народных герояў. Сапраўды, каму, як не нам, адлюстраваць веліч народнага подзвігу партызанскага краю. Што робіцца ў гэтым напрамку ў апошні час?**

— Цікавасць да гэтай тэмы не слабее. Часцей за ўсё ў аснову твораў кладуцца біяграфіі рэальных герояў. У свой час фільму «Канстанцін Заслонаў» была прысвоена Дзяржаўная прэмія СССР. Нядаўна выйшаў на экраны фільм «Бацька» рэжысёра Б. Сцяпанава. Правобразам яго героя з'явіўся Герой Савецкага Саюза Мінай Шмыроў, бацька чатырох загінуўшых дзяцей-заложнікаў. За роль Бацькі акцёр Ю. Гарабец атрымаў прыз як лепшы выканаўца мужчынскай ролі на фестывалі ў Тбілісі.

**— А што ствараецца на студыі для самых маленькіх гледачоў?**

— Хутка выходзіць карціна «Зімародак» рэжысёра У. Нікіфарава, па сцэнарыі Ю. Якаўлева, у якой расказваецца пра пошукі піянерамі былога партызана пад мянушкай «Зімародак». Ім аказваецца іх сціплы школьны настаўнік. Спецыфічна «дзіцячы» рэжысёр У. Голуб, пастаноўшчык папулярных фільмаў «Дзяўчынка шукае бацьку», «Дзеці партызана», «Анюціна дарога» і іншых, у сваім апошнім фільме «Паланез Агінскага» расказаў пра лёс маленькага скрыпача, партызанскага сувязнога. На VII Маскоўскім міжнародным кінафестывалі ў 1970 годзе фільм быў удастоены прэміі Ленінскага камсамола «Чырвоная гваздзіка», на III Міжнародным дзіцячым кінафестывалі — дыплома Міністэрства асветы СССР. Гэта не першая ўзнагарода, якую атрымліваюць беларускія фільмы для дзяцей. Напрыклад, карціна І. Дабралюбава «Іван Макаравіч» была ўзнагароджана на Міжнародным дзіцячым фестывалі ў Венецыі прызам «Сярэбраная Мінерва».

**— Дарэчы, Уладзімір Уладзіміравіч, як развіваюцца міжнародныя сувязі беларускіх кінематаграфістаў? Што чуваць пра супрацоўніцтва «Беларусьфільма» са студыямі іншых краін?**

— У апошнія гады гэтыя сувязі становяцца больш цеснымі. Некалькі год назад сумесна з чэхаславацкімі кінематаграфістамі У. Голуб паставіў карціну «Пушчык едзе ў Прагу». Толькі што закончаны здымкі беларуска-чэхаславацкага фільма «Капітан Ян», прысвечанага памяці героя славацкага народа Яна Налепкі, які змагаўся ў гады вайны разам з беларускімі партызанамі.

Замацоўваецца дружба і з польскімі кінематаграфістамі. Калі здымаўся фільм пра беларускага першадрукара «Я, Францыск Скарына», здымачная група пабывала ў Варшаве, Чэнстахове, Лодзі, Кракаве, уважліва вывучаючы крыніцы, збіраючы неабходны рэквізіт. На V Усесаюзным кінафестывалі фільм атрымаў дыплом «За плённую распрацоўку гістарычнай тэмы і выяўленчае вырашэнне». А зусім нядаўна польскія кінематаграфісты здымалі ў Беларусі фільм «Патоп» па раману Г. Сянкевіча. Натура, павільёны, адміністрацыйны апарат студыі былі ў іх распараджэнні.

Кадр з кінафільма «Бацька».

Рэжысёрам - міжнароднікам называюць А. Спешнева, які звяртаецца да тэм сучаснага палітычнага жыцця. Сцэнарый яго фільма «Чорнае сонца» атрымаў трэцюю галоўную прэмію на конкурсе, прысвечаным стагоддзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Карціна расказвае пра нацыянальна-вызваленчую барацьбу ў адной з краін Афрыкі.

Фільм «Хроніка ночы», які зараз здымае А. Спешнеў, таксама з'яўляецца вопытам філасофска-палітычнага фільма на інтэрнацыянальным матэрыяле. Дзеянне адбываецца ў міжнародным лайнеры, у якім ляцяць пасажыры розных нацыянальнасцей. Гэта як бы сучаснае грамадства ў разрэзе.

Студыя працуе напружана і ў многім плённа. Хутка яна будзе адзначаць сваё 50-годдзе. За мінулыя гады створана нямала цікавых фільмаў. Многія з іх цёпла прыняты гледачамі і прэсай.

**Гутарку вяла мастацтвазнаўца В. НЯЧАЙ.**

СПОРТ

# ШКОЛА АЛІМПІЙСКІХ ЧЭМПІЁНАЎ

Прасторная гімнастычная зала выклікае нейкае святочнае і радаснае ўзрушэнне. Яно, пэўна, ідзе ад музыкі і святла, ад дзесяткаў зграбных і гнуткіх постацей хлопчыкаў і дзяўчынак, што зараз займаюцца тут.

Вось трэнер падводзіць хлопчыкаў да кольцаў. Малыя не дастаюць яшчэ да іх рукамі. Выручае табурэтка, якую яны падстаўляюць па чарзе.

Ля «паралонавай ямы» тры дзяўчынкі. Адна стала на батут, падскочыўшы, зрабіла «вяртушку» і ўпала ў яму. Адразу ж за ёй выканала практыкаванне і другая. А трэцяя ўсё ніяк не можа адважыцца. Сяброўкі ўгаворваюць яе, зноў і зноў скачуць самі. Нарэшце, яна набралася смеласці, неяк нязграбна павярнулася ў паветры і, нібыта качаня, шлёпнулася ў яму. Дзяўчынкі радасна кінуліся абдымаць яе. Галоўнае дасягнута — страх пераадолены.

А на бервяне—слёзы. Сальта назад, якое так удала атрымалася ўчора, ніяк не выходзіць. Парады трэнераў, спачуванні равесніц выклікаюць толькі новыя ўсхліпванні...

Усяго трэці навучальны год ідзе ў «школе Дзмітрыева», як нярэдка называюць у Віцебску спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую спартыўную школу (ДЮСШ) па спартыўнай гімнастыцы абласнога таварыства «Дынама», імкнучыся адрозніць яе ад іншых таго ж профілю і падкрэсліць аўтарытэт вядучага трэнера. Варта адзначыць, што «школа Дзмітрыева», як пэўная сістэма поглядаў, заняткаў, трэніровак, узнікла і сфарміравалася многа раней, чым быў узведзены і абсталяваны гэты сапраўдны палац гімнастыкі.

Цяпер тут займаюцца каля 250 хлопчыкаў і дзяўчынак. Большасць з іх, зразумела, толькі пачынаюць сваё знаёмства са спортам. Гэта сямі-васьмігадовыя дзеці, якіх трэнеры прыкмецілі на занятках фізкультуры ў агульнаадукацыйных школах і запрасілі да сябе. Патрабаванні да дзяцей прад'яўляюць тут вельмі высокія. (Школа павінна пастаянна мець свайго прадстаўніка ў алімпійскай зборнай Саюза). Выключаюць з ліку выхаванцаў на любым этапе навучання не толькі бесперспектыўных дзяцей, але і тых, хто не ўмее і не любіць настойліва працаваць, дапускае парушэнні рэжыму, атрымлівае дрэнныя адзнакі па агульнаадукацыйных прадметах.

— Вы нават не ўяўляеце, — гаворыць дырэктар ДЮСШ Міколай Бабкін,— наколькі гэта нялёгкая справа — паведаміць бацькам і дзіцяці, што яму няма сэнсу наведваць нашу школу. Кожны раз даводзіцца даваць тысячу тлумачэнняў, раіць іншы від заняткаў. Жаданне займацца менавіта ў нас — сведчанне высокага аўтарытэту трэнераў школы, папулярнасці спартыўнай гімнастыкі ў Віцебску.



Сярод тых, хто выхоўвае юных гімнастаў, нямала вядомых у мінулым спартсменаў, майстроў спорту. Жаданне працаваць тут нярэдка выказваюць трэнеры розных гарадоў Савецкага Саюза. Але перавага аддаецца сваім, захавальнікам традыцый «школы Дзмітрыева».

У вестыбюлі ДЮСШ вісяць партрэты гімнастак, якія прынеслі свайму трэнеру вядомасць і славу. Яго першая вучаніца Ала Ітсан, першая алімпійская чэмпіёнка Ларыса Петрык... Партрэта Тамары Лазаковіч няма ў гэтай галерэі. Але яна ледзь не на ўсіх здымках на стэндах, што расказваюць аб чэмпіянатах свету, Еўропы, іншых прадстаўнічых спаборніцтвах.

Асобнае месца займаюць паведамленні з XX Алімпійскіх гульняў. Выхаванка віцебскай школы гімнастыкі прывезла з Мюнхена чатыры медалі — залаты за агульнакамандную перамогу, сярэбраны — за практыкаванні на бервяне, два бронзавыя — за многабор'е і вольныя практыкаванні.

Шлях да вяршынь спартыўнага майстэрства, да алімпійскіх узнагарод пачаўся шмат год таму назад, калі шустрая бялявая дзяўчынка трапіла ў секцыю спартыўнай гімнастыкі да Вікенція Дзмітрыева. Да гэтага Тамара займалася ў двух трэнераў, але без асаблівай ахвоты і поспехаў. Яе лічылі вельмі здольнай, угаворвалі не кідаць гімнастыку, нават бацькоў прасілі ўздзейнічаць на дачку.

— Аднойчы, — прыгадвае Тамара, — трэнер да ночы сядзеў у нас, чакаў мяне, каб пагаварыць пры бацьках. А я падыйду да вакна, гляну — сядзіць. Ну, і зноў чакаю на вуліцы. Нецікава мне было займацца, неяк занадта лёгка ўсё атрымлівалася. Трапіла я да Вікенція Дзмітрыевіча, і з першых дзён пачалася сапраўдная, сур'ёзная работа. Ён адразу ж узяўся адпрацоўваць чысціню ліній, гранічную дакладнасць рухаў.

Бясконцыя трэніроўкі да поўнай стомы, ніякіх выхадных і канікулаў, строгае выкананне рэжыму дня... Бывалі імгненні, калі хацелася кінуць усё, не паўтараць гэтыя абрыдзеўшыя практыкаванні па пяцьдзесяцтысячу разоў, не чуць спакойнага, але настойлівага голасу трэнера. Але зрабіць гэта яна ўжо не магла: захапленне гімнастыкай было мацней.

Першыя выступленні Тамары на прадстаўнічых спаборніцтвах выклікалі сенсацыю ў спартыўным свеце. Яна перамагала тытулаваных саперніц, заваёўвала вышэйшыя ўзнагароды і прызнанне гледачоў. У шаснаццаць год — чэмпіёнка краіны ў практыкаваннях на бервяне. Праз год — абсалютная чэмпіёнка V Спартакіяды народаў СССР. Уладальніца трох залатых медаляў чэмпіянату Еўропы. І вось цяпер — чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў.

Гучныя тытулы набываюць асаблівую значнасць, калі бачыш Тамару на памосце. Яе спакойны выгляд, выразнае пачуццё ўласнай годнасці, выключна спартыўная элегантнасць, стабільныя, без зрываў выступленні выклікаюць захапленне гімнасткай, якая так тонка і стрымана дэманструе прыгажосць, грацыю, абаяльнасць.

Перамогі на спаборніцтвах— гэта вынікі напружанай працы, творчых пошукаў трэнера і гімнасткі. Шлях да п'едэстала гонару пачынаецца кожную раніцу з працяглых і напружаных трэніровак, з мазалёў на ўсю далонь, з рашучасці паўтарыць сто першы раз тое, што не атрымалася сто разоў запар.

На дзвюх алімпіядах — у Мехіка і ў Мюнхене — сталі чэмпіёнкамі выхаванкі Вікенція Дзмітрыева. Ці будзе прадстаўлены Віцебск у Манрэалі, праз чатыры гады? Даць катэгарычны адказ тут немагчыма. У цудоўнай спартыўнай форме Тамара Лазаковіч. Добрыя надзеі падаюць Ніна Зелянкова, Света Кудзінава, Іра Быкоўская, Света Хадошчанка. Падрастаюць дзесяткі яшчэ маладзейшых гімнастак. Яны займаюцца ў адной зале, пераймаюць адна ў адной усё лепшае, прыстасоўваюць да сябе — выпрацоўваюць уласны стыль, індывідуальнасць.

Славутай «школу Дзмітрыева» зрабілі дзяўчаты, хаця ён, у мінулым выдатны гімнаст, пачынаў пасля траўмы як трэнер хлопчыкаў. І хто ведае, можа менавіта юнакі панясуць далей алімпійскую эстафету Віцебска.

Гэта пакуль што мары. Наперадзе яшчэ чатыры доўгія гады. У 1973 годзе Тамара Лазаковіч павінна скончыць Віцебскі тэхнікум фізкультуры, ужо цяпер яна думае паступаць у інстытут. Вікенцію Дзмітрыевічу хочацца бачыць яе на першынстве свету, якое адбудзецца ў Балгарыі ў 1974 годзе.

...Шумна скачуць на батуце першагодкі, гучыць уладарча балетмайстарскае «і-раз», уздоўж сцяны раз-пораз прабягаюць дзяўчаты перад апорным скачком. А ў прыадчыненыя дзверы залы нясмела заглядвае малая з вялікімі бантамі. Чэмпіёнка якога года стаіць на парозе?

**Валянціна ТРЫГУБОВІЧ.**

**НА ЗДЫМКАХ: чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў Тамара ЛАЗАКОВІЧ і заслужаны трэнер СССР Вікенцій ДЗМІТРЫЕЎ на сустрэчы з юнымі гімнастамі; ідзе трэніроўка.**

**Фота В. ГАНЧАРЭНКІ.**

## ЗЯЛЁНАЯ АРХІТЭКТУРА

**Запрашэнне прыбыло з Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Павільён «Кветкаводства і азеляненне» прасіў галоўнага архітэктара праектаў інстытута «Мінскпраект», старшыню секцыі ландшафтнай архітэктуры Саюза архітэктараў БССР В. Шыльнікоўскую выступіць у Кіеве на навукова-тэхнічнай канферэнцыі. Тэма даклада — «Фарміраванне гарадскога ландшафту Мінска».**

**Гэта не першая паездка мінскіх архітэктараў-ландшафтнікаў на сустрэчы па абмену вопытам. Яны выступалі ў Маскве на ўсесаюзнай нарадзе па будаўніцтву паркаў культуры і адпачынку, скліканай Міністэрствам культуры СССР, на занальнай навукова-тэхнічнай канферэнцыі архітэктараў Прыбалтыкі, Масквы, Ленінграда, Украіны і Беларусі.**

## АД БЕЛАВЕЖЫ ДА САХАЛІНА

### ЦІ СТАНУЦЬ РОБАТЫ ПАЛІГЛОТАМІ?

— Дайце, калі ласка, прыкурыць,—звяртаецца чалавек да машыны, і ў яе паслухмяна напаляецца спіралька. Усе, хто стаіць навокал, наперабой паўтараюць гэту каманду. На жаль, безвынікова. Зноў той жа голас просіць прыкурыць, і дроцік зноў чырванее.

«Яна толькі гаспадара слухаецца»,— жартуе канструктар. І мае рацыю. Машына сапраўды рэагуе толькі на яго каманды. А чалавечы голас гэтак жа строга індывідуальны і непаўторны, як і адбіткі пальцаў.

Машына, аб якой ідзе гутарка, створана вынаходнікамі Мінскага радыётэхнічнага інстытута. На ёй адпрацоўваюцца сур'ёзныя эксперыменты.

### ЦВІЦІ, САД!

Споўнілася пяцьдзесят год батанічнаму саду Латвійскага дзяржаўнага універсітэта імя Пятра Стучкі.

Універсітэцкі батанічны сад — самы буйны ў Прыбалтыцы. У яго аранжарэях вырошчваюць каля 2 200 відаў трапічных і субтрапічных раслін. А ўсяго іх тут больш за 8 500 відаў, разнавіднасцей, сартоў.

Супрацоўнікі саду падтрымліваюць дзелавыя сувязі з 800 зарубежнымі і 130 батанічнымі і навукова-даследчымі ўстановамі Савецкага Саюза.

### СВІНЦОВАЕ ПІСЬМО СЫНУ

Старажытнае грэчаскае пісьмо на свінцовай пласцінцы, згорнутай у скрутак, знойдзена археолагамі на чарнаморскім востраве Беразань. Яно датуецца шостым стагоддзем да нашай эры.

Аб існаванні ў старажытнай Грэцыі свінцовых пісьмаў упамінаюць многія антычныя аўтары. Аднак за ўвесь час існавання археалогіі такіх помнікаў грэчаскай пісьменнасці выяўлена ўсяго пяць. Знойдзенае нядаўна пасланне адрасавана адным з гандляроў свайму сыну і расказвае аб бедствах, якія ў далёкім падарожжы наклікаў на яго падманам і каварствам нейкі Матасій.

Паводле аднадушнага прызнання спецыялістаў, беразанскі скрутак вельмі добра захаваўся і з'яўляецца самым старажытным, самым доўгім і самым цікавым старажытнагрэчаскім пісьмом на свінцы.

### ТАМ, ДЗЕ ЛЯТАЛІ ЯШЧАРЫ

Пад ахову дзяржавы ўзята ўрочышча Ауліе на поўдні Казахстана. Гэты раён — адзін з нямногіх на нашай планеце, дзе захавалася мноства рэшткаў рэдкіх жывёлін, раслін, рыб, насякомых, якія жылі прыкладна 150 мільёнаў год назад.

У даўнія часы на месцы цяперашняга ўрочышча знаходзілася возера. У яго глеістых асадках апынуліся «закансерваванымі» самой прыродай шматлікія прадстаўнікі старажытнай фауны і флоры. Самымі дзівоснымі насельнікамі дагістарычнага возера былі лятаючыя яшчары, пакрытыя шэрсцю. Выяўленне іх рэшткаў у Ауліе разглядаецца палеантолагамі як сенсацыя.

## ГУМАР

*Парашутысты скачуць з самалёта. У палёце адзін звяртаецца да другога:*

*— Што рабіць, Джым? У мяне не раскрываецца парашут!*

*— Радуйся, што табе не прыдзецца яго складваць на зямлі!*

●

*Прадаўшчыца кветак гаворыць сваёй сяброўцы:*

*— Цяпер я, відаць, стала ўжо не такой прыгожай.*

*— Чаму ж?*

*— Мужчыны пачалі пералічваць рэшту, якую я ім даю.*

●

*Лонданскі карчмар звяртаецца да паліцэйскага:*

*— Пан інспектар! Гэты лайдак патрабуе, каб я бясплатна паіў яго віскі. Адвядзіце яго ў паліцыю!*

*— Навошта? У нас таксама не даюць віскі бясплатна.*

●

*— Ці не пазычыш мне форынт на трамвай?*

*— На жаль, у мяне толькі дваццатка.*

*— Давай, прыдзецца паехаць на таксі.*

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**НАШ АДРАС:**

**МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.**
**ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-65-84, 33-03-15, 33-65-91, 33-15-15.**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 1166.